КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №13 (97)
◂ 18 КРАСАВІКА 2008 г.

# Новы Час



**АЛЕГ ТРУСАЎ: «НА РАНІЦУ ГЭТА БЫЛА ДРУГАЯ ДЗЯРЖАВА»**

Стар. 4

**ЯК ЗАРАБЛЯЦЬ ГРОШЫ НА ГІТЛЕРЫ**

25 гадоў таму адбылася адна з самых цікавых і гучных афер у гісторыі: група гісторыкаў намагалася прадаць фальшывыя дзёнікі Гітлера.

Стар. 11

**МАЛДОВА + ПРЫДНЯСТРОЎЕ = ?**

11 красавіка ўпершыню за сем гадоў сустрэліся лідэр Прыднястроўскай рэспублікі Ігар Смірноў і прэзідэнт Малдовы Уладзімір Варонін. Няўжо Малдова можа зноў стаць адзінай? Пра гэта журналіст Алег Пятроў размаўляе з малдоўскім незалежным журналістам Максімам Кузолевым.

Стар. 13

**МАЛЬТЫЙСКІЯ РЫЦАРЫ І БЕЛАРУСЬ**

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

**«ЗМІЦЕР КРАЧКОЎСКІ — НАСТАЎНІК МАЛЯВАННЯ З МАЛАДЗЕЧНА»**

Працяг цыкла нарысаў Сяргея Гваздзёва пра мастакоў Віленскай школы

З НАГОДЫ

# «ДОБРААХВОТНЫ» ПАДАТАК

Аксана ХАРЛАН

**19 красавіка ў Беларусі пройдзе рэспубліканскі суботнік. Правесці яго «на добраахвотнай аснове» і «на працоўных месцах» урад Беларусі рэкамендаваў органам дзяржкіравання, арганізацыям, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.**

Замест працы на месцах можна правесці добраўпарадкаванне сквераў, паркаў, іншых зон масавага адпачынку, праезнай часткі вуліц, тратуараў і дваровых тэрыторый. Адпаведнае рашэнне ўтрымліваецца ў пастанове Савета міністраў № 517 ад 7 красавіка 2008 года.

Заробленыя на працоўных месцах у дзень правядзення рэспубліканскага суботніка грашовыя сродкі будуць пералічаны ў аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам, якія, у сваю чаргу, накіруюць 50 працэнтаў сродкаў у Міністэрства фінансаў для фінансавання мерапрыемстваў і праграм аб'яўленага сёлета Года здароўя. Сродкі будуць затрачаны на набыццё рэанімабіляў з поўнай камплектацыяй іх медыцынскай тэхнікай і іншым неабходным абсталяваннем для Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Маці і дзіця» і іншых дзяржаўных арганізацый аховы здароўя, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні Міністэрства аховы здароўя, аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама і аказваюць медыцынскую дапамогу дзецям.

Астатнія 50 працэнтаў грашовых сродкаў застануцца ў распараджэнні аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама і будуць выкарыстаны на набыццё медыцынскай тэхнікі для дзяржаўных арганізацый аховы здароўя, што аказваюць медыцынскую дапамогу дзецям.



Photo.ByMedia.net

Вось так, пасля невялікага перапынку, дванаццаты год запар кожную вясну нам прапануюць «добраахвотна» заняцца добраўпарадкаваннем месцаў жыхарства або пералічыць сродкі ў мясцовыя бюджэты. І калі раней, у савецкія часы, суботнікі ўспрымаліся як нешта само сабой зразумелае (як верныя ленінцы мы з гонарам неслі гэты пачэсны абавязак), то зараз у перыяд нібыта дэмакратыі, узнікаюць пэўныя пытанні.

Напрыклад, чаму прыбіраць скверы, паркі і іншыя зоны адпачынку трэба толькі раз на год? А ўвесь астатні час яны занесены смеццем і неўпарадкаваныя? Здаецца не, калі верыць уласным назіранням. Значыць, нехта іх усё ж прыбірае. Тады чаму шматлікія прыбіральшчыцы, дворнікі і работнікі зеленхозаў, у службовыя абавязкі якіх якраз уваходзіць «добраўпарадкаванне» і за што ім, дарэчы, плацяць грошы, не могуць гэта зрабіць 19 красавіка? Напэўна, могуць. Але задача ўлады зусім не «добраўпарадкаванне», а падпарадкаванне. Уладзе трэба прадэманстраваць сваю здольнасць кантраляваць насельніцтва, прымушаючы яго рабіць «добраахвотна» тое, што рабіць не проста не хочацца, а не мае сэнсу.

Ну які сэнс прафесару ці банкіру месці тратуар, тым больш, што гадзіна іх працоўнага часу каштуе ў некалькі разоў вышэй за гадзіну дворніка? Ніякага. Але ці шмат прафесараў і банкіраў адмовяцца ўдзельнічаць у суботніку? Мабыць адзінкі, і то наўрад ці. Вось і дасягненне мэты — выкананне грамадзянамі любых, нават самых абсурдных распараджэнняў улады.

Яшчэ адна мэта ўлады — зрабіць народу ласку за яго ж грошы. Як? Зараз растлумачу. Ніхто, напэўна, не будзе спрачацца з тым, што краіне патрэбна сучаснае медыцынскае абсталяванне, што нашы дзеці заслугоўваюць якаснага медыцынскага абслугоўвання, і нават з тым, што абвешчаны Год здароўя пойдзе насельніцтву Беларусі толькі на карысць. Але чаму абвешчаныя з такой помпай дзяржаўныя праграмы павінны двойчы аплачвацца з кішэні працоўных? Двойчы, таму што кожны працоўны кожны месяц плаціць у бюджэт падаткі, з якіх і павінны фінансавацца медыцына, культура і іншыя галіны гаспадаркі. А 19 красавіка кожны працоўны заплаціць яшчэ адзін «добраахвотны» падатак, і дарэчы не малы.

Прапаную заняцца прыкладной матэматыкай. Колькасць працаздольнага насельніцтва Беларусі каля 6 мільёнаў чалавек. З іх працуючых каля пяці мільёнаў. Сярэдняя заработная плата (гэта калі складаюцца заробкі банкіраў і дворнікаў, а потым дзеляцца пароўну) — прыкладна 300 долараў. Значыць, за адзін дзень 19 красавіка ад кожнага працуючага будзе пералічана каля 10 долараў. Памножце гэтую лічбу на 5 мільёнаў насельніцтва і атрымаеце, нават па самых прыблізных разліках, 50 мільёнаў долараў. Дарэчы, рэальная лічба атрымліваецца значна вышэй. Вось вам і ўнутраныя інвестыцыі, прычым без асаблівай напругі.

І хаця, як зазначаецца ў пастанове Савета міністраў за нумарам 517, «утрыманне наймальнікам грашовых сродкаў з заработнай платы работнікаў праводзіцца добраахвотна», пакажыце мне тых работнікаў дзяржаўных структур, якія адмовяцца гэта зрабіць. Што датычыць камерцыйных структур і недзяржаўнага сектара, то тут бываюць выключэнні. Асабіста ведаю некалькі фірмаў, кіраўніцтва якіх не пералічвае грошы за суботнік, не нарыхтоўвае сена і не шэфствуе над калгасам. Але такіх пакуль не шмат. Астатнія лічаць за лепшае заплаціць гэты «добраахвотны» падатак і спаць спакойна.

Я асабіста не бачу нічога дрэннага ў тым, каб даводзіць да ладу месца, дзе жыву: садзіць кветкі і дрэвы, фарбаваць сцены ці збіраць смецце ў скверы. Але рабіць гэта я магу ў любы дзень і па асабістаму жаданню, проста таму, што хачу бачыць свой двор чыстым і квітнеючым, а не таму што праходзіць рэспубліканскі суботнік.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БРЭСТ

**На рэйкі выходзілі дачнікі на станцыі Брэст-Паўднёвы. Яны спынілі прыгарадны цягнік Брэст—Уладава, у які не змаглі ўціснуцца.**

Кіраўніцтва чыгункі вымушана было праз некалькі гадзінаў падаць яшчэ адзін цягнік з дадатковымі вагонамі. У яго перасялі пасажыры з затрыманага цягніка, а таксама тыя людзі, якія праводзілі акцыю пратэсту на рэйках, паведамляе газета «Рэспубліка».

### ВАЛОЖЫН

**11 красавіка чытачы валожынскай дзяржаўнай раённай газеты «Працоўная слава» былі папярэджаныя, што тыя, хто адмовіцца ад падпіскі на выданне, могуць патрапіць у чорны спіс, які будзе апублікаваны на старонках газеты.**

«Таму лепш загадзя падумаць пра свой аўтарытэт і пасяшацца на пошту... Прозвішчы людзей, якія свядома ігнаруюць падпіску на «Працоўную славу», нам рэгулярна прадстаўляюць паштальёны», — папярэджвае рэдакцыя газеты.

### ГРОДНА

**Улады перашкаджалі правядзенню ў Гродна культурных мерапрыемстваў, арганізаваных актывістамі апазіцыі.**

Як паведаміў старшыня камісіі па культуры Партыі БНФ Франак Вячорка, 13 красавіка ў гродзенскім офісе АГП планавалася правесці прэзентацыю сайта Аб'яднаных дэмакратычных сіл, адкрыць выставу фатаграфій мастака, музыканта і рэжысёра Андрэя Плясанава «10 гадоў з аднаго акна» і выставу літаграфіі і графікі «Славутыя асобы Беларусі».

Актывістаў, якія ехалі ў Гродна, затрымалі супрацоўнікі Дзяржаўтаінспекцыі каля Ліды, пратрымалі на месцы прыкладна 40 хвілін, а пасля яшчэ каля дзвюх гадзін — у райаддзеле міліцыі, затым адпусцілі.

У той ж час супрацоўнікі міліцэйскага спецназа знайшлі ў гродзенскім офісе АГП разбіты ртутны тэрмометр, для правядзення дэмеркурызацыі памяшкання выклікалі МНС. Праводзіць мерапрыемства пасля такой працэдуры ў офісе забаранілі.

### ГОМЕЛЬ

**15 красавіка ў Гомелі пачаліся штогадовыя спаборніцтвы «Школа выжывання–2008».**

Як паведаміў прэс-сакратар абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, у спаборніцтвах возьмуць удзел 19 каманд — па шэсць чалавек у кожнай. Каманды раздзелены на тры падгрупы — «Авангард», у якую ўваходзяць удзельнікі старэйшыя за 18 гадоў, супрацоўнікі МНС або турысты са стажам. Падгрупа «Бойскаўты» складаецца з хлопцаў і дзяўчын 14–17 гадоў, якія раней удзельнічалі ў падобных спаборніцтвах і маюць вопыт работы з альпінісцкім рыштункам. Трэцяя падгрупа «Віцязі» — гэта навічкі «Школы выжывання».

Паводле слоў Габрылёва, удзельнікі экстрэмальных спаборніцтваў на працягу пяці сутак будуць правяраць сябе на трываласць, уменне знаходзіць правільныя рашэнні ў няпростых сітуацыях, жыць у палатках і гатаваць ежу на вогнішчы.

Акрамя традыцыйных конкурсаў па хуткасці распальвання вогнішча, адкрыванні кансерваў без нажа, аказанні першай медыцынскай дапамогі пацярпелым, сёлета чакаецца фарсіраванне на лодках Дняпра і будаўніцтва плытоў з падручных сродкаў.

### ГАНЦАВІЧЫ

**Жыхар Ганцавіцкага раёна здаў у міліцыю нямецкі пісталет «Вальтэр» часоў Другой сусветнай вайны ў рабочым стане і 20 патронаў да яго.**

Як паведаміў БелаПАН старшы інспектар аддзела правапарадку і прафілактыкі Ганцавіцкага РАУС Алег Мелехавец, 84-гадовы жыхар вёскі Будча, даведаўшыся з мясцовай газеты пра правядзенне з 14 па 19 красавіка аперацыі «Арсенал» па добраахвотнай здачы зброі, боепрыпасаў і выбуховых рэчываў, патэлефанаваў у міліцыю і папрасіў прыехаць да яго дамоў.

Супрацоўнікам раённага аддзела ўнутраных спраў ветэран Вялікай Айчыннай вайны, удзельнік партызанскага руху аддаў ваенны трафей, які быў у яго з 1944 года, а таксама 20 патронаў да яго і два магазіны. У найбліжэйшы час ніны будуць накіраваныя ў экспертна-крыміналістычны цэнтр УУС Брэсцкага аблвыканкама.

Паводле папярэдніх звестак, пісталет выраблены на адным з нямецкіх ваенных заводаў, знаходзіцца ў тэхнічна спраўным стане.

Гэта другі рарытэт, здадзены жыхарамі рэгіёну ў 2008 годзе. У пачатку красавіка жыхарка Брэсцкага раёна прынесла ў міліцыю рэвальвер сістэмы «Наган» таксама часоў другой сусветнай вайны. Ён быў знойдзены рабочымі пры разборцы гаспадарчай пабудовы ў домаўладанні, якое жанчына атрымала ў спадчыну.

### СПРАВА КАЗУЛІНА

# СПАТКАННЕ ПАД ПАГРОЗАЙ

**Пад пагрозай зрыву апынулася спатканне Аляксандра Казуліна з дочкамі, прызначанае на 26 красавіка.**

Падчас апошняга наведвання Аляксандра Казуліна адвакат Зміцер Гарачка даведаўся, што адміністрацыя не дае дазволу на спатканне ў гэты дзень. Міліцыянты тлумачаць гэта тым, што нібыта 26 красавіка не будзе вольнага памяшкання для сустрэчы вязня з дочкамі. «У калоніі людзі ведаюць, што тых, хто не збіраўся праводзіць спатканне 26-га, прымушаюць скарыстацца менавіта гэтым днём, каб была прычына адмовіць бацьку, што нібыта няма вольнага памяшкання», — каментуе сітуацыю старэйшая дачка палітыка Вольга. Паводле Вольгі Казулінай, гэта робіцца па загаду зверху пра максімальную ізаляцыю Аляксандра Казуліна. Пра фармальныя прычыны адмовы ў спатканні дачка Аляксандра Казуліна запыталася ў лісце да начальніка калоніі Віцьба–3 Віталя Агнісцікава. Вольга нагадала, што апошняе доўгатэрміновае спатканне са сваякамі ў яе таты было летась у лістападзе. Тады Аляксандр Казулін у апошні раз бачыўся са сваёй жонкай Ірынай.

### САЛІДАРНАСЦЬ

# СЯРГЕЙ І АЛЯКСАНДР СКРАБЦЫ АДНАВІЛІ ГАЛАДОЎКУ

**15 красавіка Сяргей і Аляксандр Скрабцы аднавілі галадоўку салідарнасці з палітзняволенымі.**

«Мы вырашылі працягваць галадоўку салідарнасці з палітзняволенымі ў Беларусі. Так, мы не будзем яе працягваць да сваёй смерці і прыпынім, калі нам стане горш. Але праз некаторы час мы зноў адновім галадоўку. І будзем гэта рабіць да таго часу, пакуль беларускія ўлады не вызваляць усіх палітзняволеных», — паведаміў Сяргей Скрабец.

Нагадаем, браты Скрабцы 10 сакавіка абвясцілі бестэрміновую галадоўку з патрабаваннем неадкладна вызваліць лідэра Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Аляксандра Казуліна, а таксама актывістаў маладзёжнага і прадпрымальніцкага руху Андрэя Кіма і Сяргея Парсюкевіча. 1 красавіка яны прыпынілі галадоўку. Рашэнне было прынята ў сувязі з дрэнным самаадчуваннем, якое магло перашкодзіць ім у арганізацыі мітынгу ў Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі 2 красавіка.

Паводле слоў Скрабца, галадоўка салідарнасці пакуль не паўплывала на рашэнне ўладаў. Яны працягваюць рэпрэсіі нават пад пагрозай эканамічнай блакады Беларусі з боку краін Еўропы. Сяргей Скрабец таксама паведаміў, што ў галадоўцы салідарнасці з беларускімі палітзняволенымі ўзялі ўдзел больш як 60 чалавек.

### ДАКУМЕНТ

# НОВАЕ ВАДЗІЦЕЛЬСКАЕ ПАСВЕДЧАННЕ

**Да 2011 года ў Беларусі будзе ўведзена вадзіцельскае пасведчанне новага ўзору, якое адпавядае патрабаванням усіх міжнародных канвенцый.**

Пра гэта 15 красавіка ў гутарцы з журналістамі паведаміў намеснік міністра ўнутраных спраў Віктар Філістовіч. Цяпер гэты дакумент распрацоўваецца. Паводле слоў Філістовіча, плануецца выкарыстоўваць не толькі дзейныя катэгорыі, якія даюць права кіравання або матацыклам, або легкавым аўтамабілем, грузавіком і г.д. (A, B, C&hellip), але і падкатэгорыі, бо патрабаванні да кіравання рознымі транспартнымі сродкамі нават у межах адной катэгорыі розныя. У якасці прыкладу намеснік міністра прывёў звычайны легкавы аўтамабіль і джып.

Абмену старых вадзіцельскіх пасведчанняў на новыя не плануецца. Правы новага ўзору будуць выдавацца тым, хто атрымлівае іх упершыню.

Як патлумачыў начальнік упраўлення Дзяржаўтаінспекцыі ГУУС Мінгарвыканкама Дзмітрый Карзюк, «новае вадзіцельскае пасведчанне будзе міжнароднага ўзору, беларускія вадзіцелі змогуць спакойна браць напракат аўтамабілі за мяжой, любы паліцэйскі ў іншай краіне, убачыўшы яго, зразумее, што гэта вадзіцельскае пасведчанне, а не картка для атрымання грошай у банкамаце».

БелаПАН

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПАЛЯЎНІЧЫЯ СТРЭЛЬБЫ ВІКТАРА КРЫВАЛЯ

**10 красавіка актывіста прадпрымальніцкага руху з Узды Віктара Крываля выклікалі ў міліцыю і запатрабавалі прынесці дзве паляўнічыя стрэльбы і дакументы на іх. Хаця дакументы былі ў парадку, стрэльбы забралі і загадалі, цягам месяцу іх прадаць.**

«Я ужо больш за дваццаць гадоў паляўнічы, — каментуе Віктар Крываль. — Без ніводнага парушэння і заўвагі».

Міліцыянты з Уздзенскага аддзялення міліцыі патлумачылі, што спадар Крываль двойчы прыцягваўся да адміністратыўнай адказнасці, меў спагнанні, пасягаў на грамадскі парадак і па закону пазбаўляецца права мець гэтую «зброю».

Нагадаем, 18 лютага Віктар Крываль быў асуджаны на 15 сутак арышту нібыта за тое, што раздаваў улёткі з інфармацыяй пра мітынг прадпрымальнікаў. Ён трымаў галадоўку, пратэстуючы супраць незаконнага, як ён лічыць, прысуду.

«І прычым тут стрэльбы? — пытаецца прадпрымальнік. — І тое, і другое незаконна. І таму прадаваць стрэльбы я не буду, каб нават ускосна не пацвярджаць нібыта законнасць як прысуду, так і адабрання стрэльбаў».

### МАРАЛЬ

# П'ЯНЫ СВЯТАР НА BMW

Вітольд НЯЎРЫДА

**845 тысяч рублёў штрафу і пазбаўленне на тры гады права кіраваць транспартным сродкам атрымаў у якасці спагнання 47-гадовы святар рускай праваслаўнай царквы, што ў вёсцы Усход Магілёўскага раёна, Уладзімір Кавальчук.**

У ноч з 26 на 27 сакавіка ён быў затрыманы супрацоўнікамі ДАІ на ўласным аўтамабілі BMW 520 у стане алкагольнага ап'янення.

Са словаў супрацоўнікаў ДАІ, у айца Уладзіміра былі відавочныя прыкметы алкагольнага ап'янення — ён хістаўся з боку ў бок і ад яго зыходзіў пах алкаголю. Ад тлумачэнняў айцец Уладзімір адмовіўся, падкрэсліўшы, што «Не піў!».

У судзе супрацоўнікі ДАІ патлумачылі, што святар у гэтую ноч затрымліваўся двойчы. Пры першым затрыманні разам з айцом Уладзімірам у машыне была дзяўчына дваццаці пяці год, якая таксама знаходзілася ў стане алкагольнага ап'янення. Праз некалькі гадзін святар быў затрыманы ў другі раз, у выніку чаго супрацоўнікі ДАІ склалі пратакол аб адміністратыўным правапарушэнні, пасля чаго даставілі яго ў абласны наркалагічны диспансер на асведчанне. Алкаголь у крыві склаў 1,4 працэнта праміле, што з'яўляецца амаль у тры разы больш дапушчальнай нормы.

Падчас суда айцец Уладзімір заявіў, што нічога не памятае, і не прызнаў сваю віну.

Трэба адзначыць, што Вялікі пост распачаўся ў гэтым годзе 10 сакавіка і цягнецца да 26 красавіка (Вялікадня) і забараняе хрысціянам ужываць алкагольныя напоі.

СПРАВАЗДАЧА

# ГАНДАЛЬ ЗБРОЯЙ

Валерый КАЛІНОЎСКІ

**МЗС Беларусі апублікаваў «Нацыянальную справаздачу аб палітыцы экспартнага кантролю, экспарту ўзбраенняў і вайсковай тэхнікі ў 2007 годзе».**



МЗС Беларусі рыхтуе справаздачы пра экспарт узбраенняў і вайсковай тэхнікі з 2002 года. Спачатку яны змяшчалі спісы краін, у якія прадавалася беларуская зброя, і табліцы з пералікам ды колькасцю прададзеных узбраенняў. Цяпер у справаздачы паведамляецца толькі, што Беларусь гандлявала ўзбраеннямі з 50 дзяржавамі свету, што экспарцёрамі былі 82 беларускія фірмы і арганізацыі. Летась з'явілася 8 новых фірм-экспарцёраў, за год было афармлена 250 ліцэнзій на ўвоз і вываз узбраенняў.

Права на экспарт узбраенняў і вайсковай тэхнікі, якія належаць дзяржаве, у тым ліку вайсковым часткам, перададзена тром кампаніям: «Белспецзнешттэхніка», «Белзнешпрамсэрвіс» і «Белтэхэкспарт».

Паводле інфармацыі, раней апублікаванай даследчай службай Кангрэсу ЗША, за 1998–2001 гады Беларусь прадала зброі на 1 мільярд долараў і займала паводле гэтага паказчыка 11 месца ў свеце. Тры гады таму Беларусь уваходзіла ў дваццатку найбольш актыўных прадаўцоў зброі ў свеце. Афіцыйна быў пацверджаны продаж беларускай зброі ў Іран, Судан, Кот-д'Івуар, Перу, Уганду. Вёўся гандаль самалётамі, гелікоптэрамі, бронетранспарцёрамі, танкамі ды іншай тэхнікай.

«Цяпер структура беларускага экспарту змянілася. Па-першае, запасы цяжкай тэхнікі савецкай вытворчасці скончыліся, а па-другое, у свеце вырас попыт на іншыя тавары і паслугі вайсковага прызначэння, — кажа вайсковы эксперт Аляксандр Алесін. — Спецыялізацыя Беларусі на сусветным рынку ўзбраенняў цяпер заключаецца ў пастаўках аўтаматызаваных сістэм кіравання супрацьпаветранай абаронай, авіяцыяй, сістэм навядзення для танкаў, артылерыі ды іншага. Плюс цяпер гавораць пра радары».

Паводле спадара Алесіна, апрача гэтага Беларусь актыўна займаецца мадэрнізацыяй вайсковай тэхнікі, прадае тэхналогіі падвойнага прызначэння. Аляксандр Алесін ацаніў аб'ём беларускага вайсковага экспарту за мінулы год у 300 мільёнаў долараў. Афіцыйнай інфармацыі наконт гэтага няма.

Летась Беларусь падпісала некалькі вайскова-тэхнічных кантрактаў з Венесуэлай на агульную суму 1 мільярд долараў. Гэтыя кантракты дазволяць загрузіць беларускі ВПК яшчэ на некалькі гадоў. Беларускі бок будзе пастаўляць у Венесуэлу сродкі супрацьпаветранай абароны, аўтаматызаванага кіравання, электроннай барацьбы.

ЗВАРОТ

# ПАШЫРЫЦЬ СПІС НЕЎЯЗДНЫХ

**Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры будзе хадайнічаць перад Саветам Еўропы аб пашырэнні спісу грамадзян Беларусі, якім забаронены ўезд у краіны Еўрасаюза.**

Пра гэта паведаміў старшыня таварыства Антон Астаповіч. Паводле яго слоў, такое рашэнне можна прыняць на падставе невыканання дзяржаўнымі службовымі нацыянальнага заканадаўства, міжнародных методык, рэкамендацый і прававых актаў, што цягне да страты беларускай гісторыка-культурнай спадчыны, як часткі агульнаеўрапейскай цывілізацыі. Гэта можна кваліфікаваць як праяву этнацыду.

«Прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці Беларусі выказваюць вострую занепакоенасць працягам негатыўных працэсаў у галіне зберажэння гісторыка-культурнай спадчыны беларусаў і іншых народаў, якія жылі на тэрыторыі нашай Бацькаўшчыны. Маштабы знішчэння помнікаў нацыянальнай спадчыны, як унесенай, так і не ўнесенай у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь, становяцца катастрафічнымі. Звароты і апеляцыі ў органы ўлады, кантрольна-рэвізійныя, наглядныя і праваахоўныя структуры не знаходзяць з іх боку паразумення. ...Гісторыка-культурная спадчына Беларусі — гэта не прыватная ўласнасць купкі дзяржаўных чыноўнікаў, гэта нават не набытак адной толькі нашай краіны. Матэрыяльныя і духоўныя здабыткі на беларускіх землях належаць беларусам, народам, якія жылі сярод нас, а таксама суседнім народам», — гаворыцца ў звароце да беларускага грамадства і міжнароднай супольнасці.

Таварыства аховы помнікаў прапануе ўключыць у спіс невыездных міністра культуры Уладзіміра Мацвейчука, намесніка міністра культуры, старшыню Навукова-метадычнай рады па пытаннях аховы гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі пры Міністэрстве культуры Уладзіміра Грыдзюшку, намесніка начальніка ўпраўлення аховы гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Ігара Чарняўскага, старшыню Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Міхаіла Паўлава і старшыню камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама Віктара Нікіціна.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ГРАБЛІ – 2

Сяргей САЛАЎЁЎ

**У мінулым нумары мы пісалі пра тое, што ўлада Беларусі любіць наступаць на адны і тыя ж граблі ў адносінах з міжнароднай супольнасцю. Замест таго, каб, па словах ката Леапольда, «жыць дружна», яна правакуе міжнародныя скандалы. На жаль, мы вымушаны вярнуцца да гэтай жа тэмы. Бо мінулы тыдзень перавысіў амаль усе 14 год па падставах для таго, каб сапсаваць адносіны Беларусі і астатняга свету.**



Photo.ByMedia.net

Пачнём з нядзелі. 13 красавіка памежнікамі Гродзенскага атрада ў Воранаўскім раёне ў вёсцы Радунь прыкладна за 10 кіламетраў ад беларуска-польскай мяжы былі затрыманы нефармальны лідэр грамадскага аб'яднання «Саюз палякаў на Беларусі» Анжаліка Борыс, карэспандэнт часопіса «Магазін Польскі» Ігар Банцар і восем польскіх грамадзян. Як паведаміў начальнік прэс-цэнтра Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Аляксандр Цішчанка, беларускія і польскія грамадзяне прыбылі ў Воранаўскі раён у рамках культурнага абмену, супраць чаго ніхто не пярэчыў, але знаходзіліся ў памежнай зоне без дазволу. Такім чынам, паводле яго слоў, палякі парушылі правілы знаходжання замежных грамадзян у Беларусі, беларускія грамадзяне — рэжым пагранічнай зоны.

І што? Можна было б падумаць, што яны там шпіёнілі, выведвалі нейкія звесткі, дзяржаўную таямніцу? Польскія грамадзяне абмяркоўвалі ў Радуні пытанні летняга аздараўлення беларускіх дзяцей у Польшчы, культурнага і турыстычнага абменаў! Ды памежнікі павінны былі іх не затрымліваць, а актыўна ў гэтых сустрэчах удзельнічаць, каб сваіх дзяцей на адпачынак у Польшчу адправіць! А замест гэтага яны нашкодзілі і сабе, і іншым.

Дала пра сябе ведаць Еўропа. Парламенцкая асамблея Савета Еўропы (ПАСЕ) заклікала Беларусь тэрмінова ўвесці мараторый на пакаранне смерцю. Пра гэта гаворыцца ў рэзалюцыі, што была прынята 15 красавіка пасля абмеркавання даклада аб злоўжываннях у сістэме крымінальнага правасуддзя ў Беларусі. Дакумент падрыхтаваў і прадставіў дакладчык камітэта ПАСЕ па юрыдычных пытаннях і правах чалавека Хрыстас Пургурыдэс. Апрача таго, ПАСЕ заклікае адмяніць артыкул 193-1 Крымінальнага кодэкса Беларусі, які прадугледжвае крымінальную адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі.

Больш за тое, 16 красавіка падкамітэт Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы па СМІ асудзіў прымяненне сілы ў адносінах да журналістаў на дэманстрацыі 25 сакавіка ў Мінску ў сувязі з 90-годдзем БНР і масавыя вобыскі ў беларускіх журналістаў 27 сакавіка. Падкамітэт заклікаў беларускія ўлады расследаваць гэтыя выпадкі і захоўваць свабоду СМІ ў Беларусі. У заяве падкамітэт таксама далучыўся да апасенняў РГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў» аб распрацаваным законе аб СМІ і выказаў гатоўнасць абмяркоўваць яго праект з беларускімі заканадаўцамі.

І што? Беларусь пачула заклікі не адной краіны Еўропы? Зараз жа. Аднachасова з гэтым прэс-сакратар МЗС Беларусі Андрэй Папоў заяўляе: «Практыка прыняцця негатыўных рэзалюцый ПАСЕ па Беларусі, якія не ўтрымліваюць канструктыўных элементаў для наладжвання рэальнага супрацоўніцтва і дыялогу, — контрпрадуктыўная і не мае перспектывы».

Выбачайце — вам прапанавалі канструктыўныя элементы. Мараторый на смяротнае пакаранне, спыненне супрацьзаконных вобыскаў, адвольнай канфіскацыі тэхнікі, задаволіць права грамадзян на свабоду сходаў. Элементарныя правы чалавека, якія запісаныя ў Канстытуцыі Беларусі, Пакце аб грамадзянскіх і палітычных правах, ратыфікаваным Беларуссю, Сусветнай Дэкларацыі Правоў Чалавека, падпісанай Беларуссю.

Беларусі ўсё гэта не трэба. 16 красавіка ў судзе Цэнтральнага раёна Мінска пачаўся працэс над дзесяццю грамадскімі актывістамі, затрыманымі 10 студзеня падчас несанкцыянаванай акцыі пратэсту прадпрымальнікаў. Падсудныя абвінавачваюцца ў правапарушэнні, прадугледжаным ч. 1 арт. 342 Крымінальнага кодэкса (арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, якія груба парушаюць грамадскі парадак, або актыўны ўдзел у іх). Працэс вядзе суддзя Алена Ільіна.

Усяго ў якасці абвінавачваных па дадзенай крымінальнай справе праходзяць 14 чалавек. Адзін з іх, Андрэй Кім, адначасова з'яўляецца падсудным па іншай справе: ён абвінавачваецца ў тым, што ўдарыў супрацоўніка ДАІ на яшчэ адной акцыі пратэсту прадпрымальнікаў, якая праходзіла 21 студзеня. З канца студзеня малады чалавек утрымліваецца ў следчым ізалятары. Большая частка абвінавачваных знаходзяцца пад падпіскай аб нявыездзе.

«Беларуская судовая сістэма чарговы раз пацвердзіла сваю поўную залежнасць ад меркавання ўлады. Паказальны нават той прыклад, што калі мы з сябрамі, таксама падсуднымі, зайшлі ў пакой суддзі, каб патрабаваць нашых сведкаў, то там сядзеў пракурор. З гонарам адказваў на ўсе пытанні і сядзеў, нібыта, гэта ягонае працоўнае месца. Аб чым можна казаць? Калі пракурор і суддзя працуюць разам і ў перапынках п'юць гарбату, то... Не робіцца нават выгляду, імітацыі і мінімальнага раздзялення пракурорскай і судовай улады», — падсумаваў вынікі першага дня працэсу адзін з абвінавачваемых, Міхаіл Пашкевіч.

Такім чынам, улады, нібыта, зрабілі крок насустрач Еўропе, вызваліўшы ўсіх палітвязняў, за выключэннем Аляксандра Казуліна. А зараз, замест аднаго палітвязня, узнікне дадаткова 10. Не лічачы смяротнага пакарання, арыштаў тэхнікі і адвольных вобшукаў.

Граблі. Вельмі шкада, што на іх наступаюць адзінкі, а ў галаву атрымлівае ўся краіна.

▸ ЮБІЛЕЙ–13

# Алег Трусаў: «НА РАНІЦУ ГЭТА БЫЛА ДРУГАЯ ДЗЯРЖАВА»

**Ноч з 11 на 12 красавіка 1995 году належыць гісторыі. Тады дэпутаты Вярхоўнага Савету 12-га склікання ад апазіцыі БНФ і БСДГ абвясцілі галадоўку і засталіся ў Авальнай залі Дома ўрада, дзе былі жорстка збітыя і гвалтам выдаленыя з будынку. Падставай для пратэсту стала ініцыятыва Аляксандра Лукашэнкі правесці рэферэндум, скіраваны на скасаванне беларускай мовы як адзінай дзяржаўнай, бел-чырвона-белага сцяга і гербу «Пагоня» як дзяржаўных сімвалаў і на роспуск Вярхоўнага Савета. З дэпутатам Вярхоўнага Савета 12-га склікання Алегам Трусавым гутарыць Аляксей Кароль.**



***— З дыстанцыі мінулых трынаццаці гадоў, як можна вызначыць прычыны той расправы над дэпутатамі, па сутнасці — разгону вярхоўнай улады ў краіне? Ці чакалі вы нечага падобнага? Чаму гэта адбылося?***

— З аднаго боку, у нейкай ступені чакалі. Чаму? Таму што парушэнне заканадаўства ўжо да гэтага ішло поўным ходам. Я, напрыклад, далучыўся да галадоўкі з патрабаваннем свабоды прэсы і вяртання на пасаду галоўнага рэдактара «Народнай газеты» Іосіфа Сярэдзіча. Бо калі знялі з пасады рэдактара газеты — на той час органа Вярхоўнага Савета насуперак волі Савета, стала ясна, што закон у краіне не выконваецца, што новая структура выканаўчай улады ідзе ў наступ на заканадаўчую ўладу і не спыніцца перад парушэннем закона. Іншая справа, што калі пачалося збіццё, то некаторыя наогул думалі, што нас заб'юць.

***— Якім быў Ваш псіхалагічны стан у той момант і пасля?***

— Пасля гэтага я перастаў баяцца. Савецкі страх, які сядзеў ва мне генетычна, знік. Мы шчыльна шчапіліся за рукі, ім далёка не адразу ўдалося нас разадраць. А білі жорстка. Усё цела было сінім. Рука паўгода не падымалася. Але яны і самі баяліся. Калі нам удалося з двух-трох чалавек сарваць маскі, то тыя кінуліся на падлогу і закрылі твары рукамі. Праз колькі год у метро да мяне падышоў невядомы мне чалавек і папрасіў прабачэння за свой удзел у збіцці.

***— Як вы ацэньваеце палітычны вынік той ночы?***

— З аднаго боку, збіццё паказала, што дэмакратыя ў Беларусі скончылася. Дарэчы, гэта не навіна для гісторыі. Узгадвацца збіццё дэпутатаў у італьянскім парламенце, пасля якога Мусаліні прыйшоў да ўлады, разгром парламента Юзэфам Пілсудскім. Фактычна мы наглядаем як бы паўтор эпізодаў з еўрапейскай гісторыі, толькі са спазненнем па часе.

Да збіцця дэпутатаў была адна дзяржава — на раніцу 12 красавіка гэта была ўжо другая дзяржава. Мне як гісторыку ноч з 11 на 12 красавіка 1994 года — пачатак адліку канца дэмакратыі. Не рэферэндум лістапада 1996 года, не змены ў Канстытуцыі, як лічаць некаторыя дэпутаты 13-га склікання, а гэта ноч.

Чаму? Таму што, калі мы абвясцілі галадоўку, у гэты дзень на пасяджэнні ВС дэпутаты большасцю галасоў адхілілі тры з чатырох прапаноў Лукашэнкі па пытаннях рэферэндуму: пра змену дзяржаўнай сімволікі, мову і роспуск Вярхоўнага Савета. Адказам было збіццё. Усё астатняе — потым.

***— Удакладнім дэталі: паседжанне праходзіла, калі ўжо пачалася галадоўка?***

— Так. Галадоўка пачалася а 9-й раніцы. Праз гадзіну далучыўся я, потым Антончык. Яшчэ некалькі чалавек. Мы сядзім каля трыбуны, мы глядзім у вочы тым, хто галасуе, і яны не падтрымліваюць фармулёўкі пытанняў, прапанаваных прэзідэнтам. Спікер Мечыслаў Грыб абвяшчае адно пытанне — не праходзіць. Другое — не праходзіць…

Супраць галасавала большасць дэпутатаў, якая якраз складала тую самую, па тагачаснай тэрміналогіі, кансерватыўную большасць Вярхоўнага Савета. Усе разумелі, чым пагражае рэферэндум па прапанаванаму сцэнару. Гэтыя пытанні не прайшлі, не хапіла 174 галасы, каб была простая большасць. Прагаласавалі толькі за нармальнае чацвёртае пытанне — за эканамічны саюз з Расіяй. Мы выйгралі законным дэмакратычным шляхам.

І таму ўлада пайшла ва-банк. Бо калі б яны нас брутальна не пабілі, не выкінулі з памяшкання, то на заўтра парламент пайшоў бы далей. То бок, Вярхоўны Савет дванаццатага склікання аказаўся ў прынцыпе сумленным.

***— Такім чынам, Вы, па вялікім рахунку, дасягнулі мэтаў, якія ставілі пачынаючы галадоўку. Ці не было б лагічным на гэтым галадоўку спыніць, працягнуць пасяджэнне Вярхоўнага Савета і дамагацца, ужо ў якасці законатворцаў, правядзення прынятых рашэнняў у жыццё?***

— Мы дабіліся толькі частковай перамогі, таму што з парадку дня гэтыя пытанні не былі знятыя. І мы разумелі, што калі мы заўтра падымемся ў залю, яны могуць гэтыя пытанні па новай узняць, і не вядома, што будзе. Таму мы вырашылі галадаваць да канца сесіі, калі ўвесь парадак дня скасуецца і вяртанне да гэтых пытанняў стане немагчымым. Так, дарэчы, і атрымалася: пасля збіцця зноў гэтыя пытанні паставілі і ўжо атрымалі тыя вынікі, якія хацелі.

***— Акцыя спрацавала на застрашэнне?***

— Канешне, дэпутаты баяліся за свой лёс. Пасля таго, як была парушана дэпутацкая недатыкальнасць, калі ў парламент увайшлі ўзброеныя людзі, што забаронена законам, большасць проста спалохалася.

***— А няўжо яны не разумелі, што на гэтым усё роўна завяршаецца іх лёс, ва ўсялякім разе, палітычны?***

— Не разумелі. Многія спадзяваліся на прымірэнне і дамоўленасці, на нейкія пасады. Пайшлі 190 чалавек на развітальны банкет, які ладзіў прэзідэнт. І Грыб там быў, дарэчы. Людзі не разумелі «па кім звоніць звон».

***— Як склаліся іх лёсы? Якая частка ўладкавалася ў новай сістэме?***

— Думаю, меншая, прычым з тых, хто галасаваў «за» і першы раз. Тыя, хто вагаўся і бегаў тудысюды, зараз або проста пенсіянеры, або працуюць на невялікіх пасадах.

***— Якой была, якой магла быць і якой павінна была быць рэакцыя Вярхоўнага Савета на падзеі той ночы?***

—Тут усё залежала ад Мечыслава Грыба — кіраўніка парламента і прэзідыума. Спачатку хацелі праводзіць сесію ў памяшканні Вярхоўнага Савета, на Карла Маркса, 38. Аднак Мечыслаў Грыб пасля сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам згадзіўся праводзіць паседжанне ў залі Дома ўраду.

***— А якая розніца, дзе праводзіць паседжанне?***

— Ёсць добрая прымаўка, што ў сваім доме і сцэны дапамагаюць. Будынак Дому ўраду ўжо не належаў Вярхоўнаму Савету, ён належаў прэзідэнту і ўраду. А будынак на Карла Маркса, 38 яшчэ быў Вярхоўнага Савета, і той мог прыняць рашэнне праводзіць закрытае пасяджэнне, без усялякай дадатковай аховы, але з допускам прэсы, на той час яшчэ шматлікай. І гэта было б вельмі важкім стрымліваючым фактарам супраць паўтору начной акцыі. Бо калі б сярод белага дня ў залю пасяджэння ўварваліся людзі ва ўніформе, то інакш, як разгонам парламента, адкрытым пераваротам, відавочным для ўсяго свету, гэту акцыю патлумачыць было б цяжка. Вакол Дому ўрада, у самім будынку пасля той ночы знаходзілася безліч людзей у форме.

Дарэчы, праз два тыдні будынак на Карла Маркса ў Вярхоўнага Савета адабралі, узамен далі некалькі паверхаў у Доме ўрада, забралі таксама з распараджэння Грыба машыны. Інакш кажучы, як толькі выйгралі пытанне пра рэферэндум — забралі бастыён.

Калі б пасяджэнне праходзіла ў памяшканні ВС, вынікі яго маглі б быць іншымі.

***— Сутнасць таго моманту барацьбы — захаванне статус-кво?***

— Так. За ўладу. Таму што парламент тады мог прагаласаваць за Канстытуцыю, за дэмакратычны падзел уладаў. Тым больш, што факт збіцця, уварвання невядомых узброеных людзей у парламент быў падкрэслены: тагачасны генеральны пракурор спадар Шаладонаў па гэтым факце завёў крымінальную справу, пачалося следства. І парламент меў усе паўнамоцтвы (яны заканчваліся праз месяц) выклікаць кіраўнікоў усіх сілавых структур, стварыць для расследавання парламенцкую камісію і гэтак далей. Таму і спяшаліся з рэферэндумам. Нягледзячы на яшчэ адно парушэнне, бо рэферэндум па закону нельга было праводзіць бліжэй шасці месяцаў да канца тэрміну дзеяння. Ну і, канешне, вельмі адмоўную ролю адыграў Канстытуцыйны суд. Пачаў гульню ў адпіскі з намі, а скончыў поўным фіяска ў 1996 годзе.

На жаль, многія з актыўных палітычных фігур таго часу баяліся за свой далейшы лёс, іншыя не разумелі, хаця б з гістарычнага досведу, магчымых наступстваў таго развіцця падзей, якія ўжо з відавочнасцю абазначыліся. Нават для сябе саміх. Тыя ж Анатоль Лябедзька, Віктар Ганчар, Юры Захаранка, які тады ўзначальваў міліцыю, і якую зрабілі закладнікам сітуацыі. Міліцыянты не ўдзельнічалі непасрэдна ў нападзе, але стаялі вакол шэрагамі ў поўнай амуніцыі.

***— Колькі дэпутатаў удзельнічала ў галадоўцы, ці дакладней будзе сказаць, у акцыі супраціву ў парламенце? Большая колькасць удзельнікаў магла паўплываць на ход падзей?***

— Дзевятнаццаць. Безумоўна, магла. І нават не проста колькасць, а далучэнне да нашай групы некалькіх выключна паважаных, аўтарытэтных, вядомых у нас і за мяжой асоб. Увіце: мы селі, а побач сядаюць Гілевіч, Шушкевіч, Карпенка, якія потым выступаў у нашу падтрымку, але было позна. І я не ўпэўнены, што тады б рашыліся на збіццё.

***— У гэтым кантэксце — пытанне, якое гучала ў той час ды не страціла актуальнасці да дня сённяшняга і якое адлюстроўвае розныя адносіны розных груп дэмакратаў і насельніцтва да вашай акцыі: ці была гэта акцыя дакладна прадумана з разлікам і на большую колькасць удзельнікаў, і на паэтапнае дасягненне пэўных вынікаў?***

— Нічога з гэтага зроблена не было. Таму што сама ідэя галадоўкі ўзнікла спантанна, бо іншага выйсця ўжо не заставалася. Не заставалася і часу. Я, напрыклад,быў супраць галадоўкі, але няёмка было людзей падводзіць. Пайшла на галадоўку не ўся апазіцыя, частка не ўдзельнічала па розных прычынах. Але калі мы ўжо селі, каб да нас далучыліся людзі не з апазіцыі, а проста дэмакраты, то перамога хутчэй за ўсё была б за намі. Але яны не адчулі гэтага моманту.

***— Відавочна, не з боязі, а з уяўлення пра іншыя магчымасці супрацьдзеяння. Што можна сказаць на гэты конт праз трынаццаць гадоў?***

— Я і не кажу пра боязь. Але і тады, і сёння, тым больш з улікам усіх падзей палітычнага развіцця за гэтыя 13 гадоў, я не бачу іншых варыянтаў. Таму што галоўныя, зыходныя парушэнні былі зроблены, калі прымалі Канстытуцыю, уводзілі пасаду прэзідэнта праз галасаванне па іменных бюлетэнях на працягу тыдня. У мяне мой бюлетэнь да гэтага часу захоўваецца, бо мы не прымалі ўдзел у тым галасаванні. Здаецца, дробязі — парушэнне працэдуры. Але не было б іх, захавалася б парламенцкая рэспубліка. Ад той даты — прыняцця Канстытуцыі з папраўкай на ўвядзенне пасады прэзідэнта ад 15 сакавіка 1994 года — да даты нашага збіцця прайшоў усяго толькі год. І менш года да рэферэндуму ў лістападзе 1996 года. Менш чым два гады спатрэбілася, каб поўнасцю скасаваць дэмакратыю. Прамежкавыя этапы гэтага працэсу: самі дэпутаты, ужо новага 13-га склікання, прагаласавалі за адмену непасрэднай трансляцыі пасяджэнняў ВС, перадачу СМІ пад кантроль выканаўчай уладзе, зацвердзілі вынікі рэферэндуму. І ўрэшце — самі былі заменены на Палату прадстаўнікоў.

***— Між тым, насуперак намаганням выканаўчай улады, выбары ў Вярхоўны Савет 13-га склікання адбыліся. Значыць, была ў грамадстве падтрымка, было на каго абапірацца?***

— Прычым моцная. Па выніках галасавання за Шушкевіча, за Пазняка на першых прэзідэнцкіх выбарах, на выбарах у ВС 13-га склікання галасавалі мільёны два. Яны і зараз ёсць. І менавіта таму мы тут сядзім і робім гэта інтэрв'ю. Любая дыктатура моцная настолькі, наколькі ёй дазваляе грамадства. Мы перажываем не канец, а толькі паўзу ў дэмакратычным развіцці краіны.

***— Якія ўрокі вы асабіста вынеслі з тых падзей?***

— Першы: у момант ікс неабходна аб'яднанне ўсіх дэмакратычных сіл, нягледзячы на колеры і адценні — левых і правых, белых, сініх, ружовых… Калі адны глядзяць, як другіх збіваюць, — перамогі не будзе. Другі: наша грамадства пакуль што застаецца сервільным. Калі б пасля нашага збіцця на плошчу перад Домам ураду прыйшло 50 тысяч, то ВС не пабаяўся б прыняць рашэнні ў абарону дэмакратыі. І лёс краіны быў бы іншы.

ТЭОРЫЯ

# БЕЛАРУСКІ СУЛТАНІЗМ

Ігар БАРЫСАЎ

**На думку сучасных палітолагаў Хуана Лінца і Альфрэда Стэпана, традыцыйная трохчленная мадэль рэжымаў ужо састарэла і не можа апісаць усе існуючыя ў свеце палітычныя рэжымы. Яны прапаноўваюць дадаць да трохчленнай мадэлі (якая апісвае дэмакратычныя, аўтарытарныя і таталітарныя рэжымы) яшчэ два тыпы рэжымаў — посттаталітарызм і султанізм. Нас цікавіць апошні тып.**



## Султанізм паводле Лінца і Стэпана

Лінц і Стэпан апісваюць султанізм як крайнюю форму неапатрыманіяльнага панавання, падкрэсліваючы яго асаблівасці ў сучаснасці:

— дэспатычная і непрадказальная ўлада, нізкі ўзровень інстытуцыяналізацыі;

— маніпуляванне сімваламі, бязмежнае ўзвелічэнне правадыра. Не існуе дзяржаўнай ідэалогіі. Псеўдаідэалогія, якая звязана з імем кіраўніка, не служыць сродкам забеспячэння лаяльнасці функцыянераў і падданых, сродкам знешнепалітычнай прапаганды;

— палітычная мабілізацыя мае цырыманіяльны ці выпадковы характар;

— кіраўніцтва персаналістычнае. Адносіны функцыянераў будуюцца на страху і ўзнагародах. Набліжанымі да правадыра становяцца члены ягонай сям'і, сябры, былыя калегі па працы, сваякі або людзі з ахоўных структураў.

## Макс Вебер пра султанізм і патрыманіялізм

Першым, хто апісаў у сваёй працы султанізм, быў нямецкі сацыёлаг, прававед і эканаміст Макс Вебер. Ён разглядаў султанізм як крайнюю форму патрыманіяльнага панавання.

Само паняцце «патрыманіялізм» бярэ свой пачатак ад слова patrimonium, якое ўпершыню сустракаецца ў рымскім праве і азначае атрыманне ў спадчыну радавой маёмасці.

Згодна Максу Веберу, патрыманіялізм узнікае там, дзе да традыцыйнага панавання ўладара дадаецца апарат адміністратыўнага ці ваеннага кіравання.

Патрыманіяльнае панаванне па сваёй форме арыентавана дастаткова традыцыйна, нават калі яно здзяйсняецца на падставе ўласнага права. Там, дзе патрыманіяльнае панаванне базуецца на свабодным ад традыцыйнага абмежавання бязмежжы, яно становіцца султанізмам.

## Шмуэль Эйзенштадт пра неапатрыманіялізм

Эйзенштадт вылучыў асаблівасці неапатрыманіялізму:

1) Палітычны цэнтр аддзелены і незалежны ад перыферыі, ён канцэнтруе палітычныя, эканамічныя і сімвалічныя рэсурсы ўлады, адначасова зачыняе доступ усім астатнім групам і слаям грамадства да гэтых рэсурсаў і пазіцыяў кантролю за імі;

2) дзяржава кіруецца як прыватнае валоданне (патрымоніум) кіруючых групаў — носьбітаў дзяржаўнай улады, якія прыватызуюць разнастайныя грамадскія функцыі і інстытуты, ствараючы з іх крыніцы ўласных прыватных прыбыткаў;

3) этнічныя, кланавыя, рэгіянальныя і сямейна-родасныя сувязі не знікаюць, а адраджаюцца ў сучасных палітычных і эканамічных стасунках, пры гэтым акрэслівае спосабы і прынцыпы іх функцыянавання.

## Практыка султанізму ў свеце

Вялікая група краінаў — Гаіці пры Дзювалье, Цэнтральна-Афрыканская Рэспубліка пры Бакаса, Філіпіны пры Маркасе, Румынія пры Чаўшэску, Іран пры шаху, Паўночная Карэя пры Кім Ір Сене — маюць яскрава выяўленыя тэндэнцыі да крайняй формы патрыманіяльнага панавання, якое Макс Вебер назваў «султанізмам».

Да гэтай групы краінаў палітолагі адносяць і некаторыя азіяцкія краіны СНД (Азербайджан, Казахстан, Узбекістан, Кіргізія, Туркменістан) і Беларусь, дзе султанізм узнік у выніку распаду СССР. Гэтыя краіны неабходна разглядаць як краіны з неапатрыманіяльным панаваннем і яго крайняй праявай — султанізмам.

## Султанізм у Беларусі

Трэба адзначыць, што султанізм на Беларусі праяўляецца не ў чыстым выглядзе, а яшчэ дзе-нідзе застаецца месца і класічнаму аўтарытарызму. На сучасны момант, карыстаючыся класіфікацыяй Лінца і Стэпана, беларускі рэжым можна ахарактарызаваць як султанісцка-аўтарытарны.

З моманту распаду СССР і атрымання Беларуссю незалежнасці, беларускі палітычны рэжым паступова відазмяняўся. У 1991–1994 гадах у краіне існавала некансалідаваная дэмакратыя, квазіпарламенцкая рэспубліка. У 1994–1996 гадах, пасля абрання першага прэзідэнта, зараджаецца аўтарытарызм. У 1996–2004 гадах адбываецца кансалідацыя рэжыму і пачынаюцца першыя праявы султанізму, з 2004 года — па сучасны момант адбываецца трансфармацыя рэжыму ў неапатрыманіялізм са шматлікімі элементамі, якія ўласцівы султанізму.

Да гэтай групы краінаў палітолагі адносяць і некаторыя азіяцкія краіны СНД (Азербайджан, Казахстан, Узбекістан, Кіргізія, Туркменістан) і Беларусь

Калі супаставіць ідэальныя характарыстыкі аўтарытарызму і султанізму, прапанаваныя Лінцам і Стэпанам, з беларускім палітычным рэжымам, то найбольш важныя з іх праяўляюцца ў сферы палітычнага лідэрства, плюралізму, ідэалогіі, мабілізацыі і правоў чалавека. У гэтым выпадку можна згадзіцца з Эйкам і Кузіо: «Палітычны рэжым у Беларусі мае атрыбуты персаналістычнай аўтарытарнай дыктатуры з некаторымі элементамі султанізму, дзе ўсе палітычныя функцыі манапалізаваны прэзідэнтам; размыта заканадаўчая, выканаўчая і судовая ўлады; абмежавана эканамічная прастора і сацыяльны плюралізм, татальнае знікненне палітычнага плюралізму і спаборніцтва паміж партыямі». З такой пазіцыяй згаджаецца і беларускі палітолаг Уладзімір Роўда.

## Палітычнае лідэрства

Рэферэндум 1996 года і папраўкі да Канстытуцыі 1994 года сталі выніковымі ў канцэнтрацыі выканаўчай, заканадаўчай і судовай улады ў руках прэзідэнта. Гэта стала апорай персаналісцкага рэжыму Лукашэнкі, у выніку чаго прэзідэнт пераўтварыўся ў адзіную крыніцу асабістай улады.

Выканаўчая ўлада ў краіне здзяйсняецца дзякуючы цалкам падсправаздачным перад Лукашэнка ўрадам, «прэзідэнцкай вертыкаллю» і Адміністрацыяй прэзідэнта. Гэтыя структуры жорстка іерархізаваныя. Адміністрацыя прэзідэнта адыгрывае адну з вядучых пазіцый у краіне і з'яўляецца моцным цэнтрам па ўплыву за сітуацыяй у краіне.

Тыповыя рысы султанізму ў Беларусі праяўляюцца ў вышэйшай ступені на кіраванні, якое заснавана на персаналізме і бязмежжы; адсутнасці аўтаноміі дзяржаўных службоўцаў; падпарадкаванні кіраўніку, якое абапіраецца на страх і асабістыя ўзнагароды; фармаванні атачэння кіраўніка з сяброў, калегаў па працы, людзей, якія спрычыніліся да здзяйснення гвалту для захавання ўстойлівасці рэжыму; атрыманні пасадаў у залежнасці ад асабістай адданасці кіраўніку.

Пасля рэферэндуму 2004 года палітычнае лідэрства становіцца чыста султанісцкім.

## Ідэалогія

Нягледзячы ні на што, у краіне захоўваюцца фармальныя «рацыянальна-легальныя» абмежаванні прэзідэнта, і кіраўнік дзяржавы спрабуе легітымаваць сваё панаванне спасылкамі на ідэалогію, што, у сваю чаргу, уласціва для класічных султанісцкіх рэжымаў.

Беларуская ідэалогія, прапанаваная дзяржавай у 2003 годзе, адпавядае больш султанісцкай, чым таталітарнай мадэлі. Беларускі лідэр сфармаваў прынцыпы псеўдаідэалогіі чыста персаналістычнага тыпу. Гэта вельмі моцна адрозніваецца ад таталітарных ідэалогій сваім яскравым правінцыйным характарам. Фактычна ў яе ніхто не верыць.

## Мабілізацыі

Час ад часу султанісцкія рэжымы практыкуюць «маніпуляцыйную мабілізацыю цырыманіяльнага тыпу». Лідэры праводзяць фестывалі, цырыманіяльныя святы, рэферэндумы і выбары. Тое самае практыкуецца і ў Беларусі. Рэжым Лукашэнкі з'яўляецца арыентаваным на эмацыйную падтрымку.

## Плюралізм

Роднасць сучаснага рэжыму з класічным аўтарытарызмам праяўляецца ў наяўнасці некаторых элементаў плюралізму ў сацыяльным і эканамічным сектарах, якія не існавалі ў грамадстве да станаўлення дзеючага рэжыму. Але такі плюралізм часта падвяргаецца непрадказальным валявым умяшанням з боку кіраўніка дзяржавы. У грамадзянскай супольнасці не існуе ніводнай групы, якой была б гарантавана пратэкцыя ад здзяйснення дэспатычнай улады.

Узмацненню султанізму спрыяе нізкі ўзровень інстытуцыяналізацыі палітычнай сістэмы, адсутнасць бар'ераў паміж сферамі «публічнага» і «прыватнага», паглыбленне ізаляцыі краіны на міжнароднай арэне. Найбольшая частка ўласнасці (каля 85 працэнтаў) належыць дзяржаве, а гэта азначае, што яна належыць правадыру.

Працэс звужэння сацыяльнага абшару для самаарганізацыі грамадства рэзка паскорыўся адразу пасля прэзідэнцкіх выбараў 2001 года. Нагадаю: закрыццё дзесяткаў няўрадавых арганізацый, рэзка пагоршаныя ўмовы існавання незалежнай прэсы, захады для абмежавання міжнародных кантактаў студэнтаў і навучэнцаў, гісторыя з ліквідацыяй коласаўскага ліцэю і Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэту, узмацненне жорсткасці пакаранняў журналістаў, выцясненне апошніх міжнародных дабрачынных арганізацый, ціск на незалежныя прафсаюзы і ўвядзенне кантрактнай сістэмы найму рабочых.

## Правы чалавека

Толькі на полі правоў чалавека Беларусь працягвае заставацца класічным аўтарытарным рэжымам. Пачынаючы з 1996 года ніводныя выбары ці рэферэндум, што праводзіліся ў Беларусі, не былі прызнаныя міжнароднай супольнасцю як свабодныя і справядлівыя (выключэнне складалі, вядома, Расія і краіны СНД).

## ДЗІЦЯЧАЯ ТЭМА

### ПРАГРАМА «ДЗЕЦІ БЕЛАРУСІ»

**На будаўніцтва аб'ектаў у рамках праграмы «Дзеці Беларусі» ў 2008 годзе плануецца накіраваць больш за 60 мільярдаў рублёў, паведаміла прэс-служба Міністэрства эканомікі.**



Photo.ByMedia.net

Прызначана ўвесці ў дзеянне 22 аб'екты. Найбольш буйныя з іх: дзіцячы рэабілітацыйна-аздараўленчы цэнтр «Ветразь» у вёсцы Касцяні Пастаўскага раёна, культурна-аздараўленчы цэнтр Лужаснянскай школы-інтэрнат-гімназіі Віцебскага раёна, прыбудова да школы з рэканструкцыяй дзейнага будынка школы ў вёсцы Сялецкае Касцюковіцкага раёна ў Магілёўскай вобласці. Па два жылыя дамы для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, будзе пабудавана ў кожным рэгіёне (у Мінску — кватэры).

Устаноўленымі заданнямі на працягу тэрміну рэалізацыі прэзідэнцкай праграмы да 2010 года прадугледжваецца ўвесці ў эксплуатацыю 95 дзіцячых лячэбных, прафілактычных і вучэбна-выхаваўчых устаноў, аб'ектаў адукацыі, аб'ектаў жылля, а таксама стварэнне вытворчых магутнасцей па выпуску прадуктаў дзіцячага харчавання. На фінансаванне будаўніцтва гэтых аб'ектаў плануецца накіраваць каля 270 мільярдаў рублёў, уключаючы сродкі рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў, уласныя сродкі арганізацый, крэдыты банкаў і інш. З улікам сацыяльнай накіраванасці гэтага будаўніцтва асноўнай крыніцай з'яўляецца рэспубліканскі бюджэт.

**БелаПАН**

### НАСІЛЛЕ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ДЗЯЦЕЙ

**У Мінску прайшла міжнародная канферэнцыя «Насілле ў дачыненні да дзяцей: праблемы і шляхі прадухілення».**

Канферэнцыя арганізавана ў супрацоўніцтве з Цэнтральнаеўрапейскай ініцыятывай (ЦЕІ), Міжнароднай арганізацыяй па міграцыі (МАМ), Арганізацыяй па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе (АБСЕ), Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ) і пры фінансавай падтрымцы гэтых арганізацый. Ініцыятарам мерапрыемства выступіла Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі.

У працы форуму прынялі ўдзел прадстаўнікі прыблізна 30 краін, а таксама дзесяці міжнародных і сямі няўрадавых арганізацый. У прыватнасці, прадстаўнікі праваахоўных і іншых дзяржорганаў краін-членаў ЦЕІ, СНД, шэрагу дзяржаў Еўрапейскага саюза, рэгіёнаў Персідскага заліва, Блізкага Усходу, Паўднёва-Усходняй Азіі і інш.

Удзельнікі форуму абмяняліся думкамі, вопытам і практычнымі напрацоўкамі, што тычацца папярэджання жорсткага абыходжання з дзецьмі. У прыватнасці, праведзены агляд міжнароднага і нацыянальнага заканадаўства аб абароне дзяцей ад насілля і практыкі яго прымянення, прааналізавана агульная сітуацыя ў свеце ў гэтай сферы. Размова таксама ішла пра ролю грамадскіх арганізацый у папярэджанні насілля над дзецьмі.

**БелаПАН**

### «ШКОЛА – ПАРТНЁР БУДУЧЫНІ»

**У Беларусі пачалася рэалізацыя міжнароднай ініцыятывы «Школа — партнёр будучыні». Пра гэта паведаміла кансультант па нямецкай мове Інстытута імя Гётэ Катарына Ланге.**

Праект ініцыяваны МЗС Германіі і ў перспектыве заклікаены аб'яднаць у агульную сетку каля тысячы школ ва ўсім свеце. У трохгадовым праекце бяруць удзел чатыры беларускія школы, што былі адабраны Інстытутам імя Гётэ: СШ № 28 у Гродне, СШ № 7 у Слуцку, СШ № 206 і гімназія № 56 у Мінску.

У Беларусі ініцыятыву «Школа — партнёр будучыні» каардынуюць пасольства ФРГ, Цэнтральнае бюро па справах школьнай адукацыі за мяжой (ZfA), Германская служба акадэмічных абменаў (DAAD) і Інстытут імя Гётэ.

Паводле слоў Ланге, у Міністэрстве адукацыі Беларусі адбыліся перамовы з выкладчыкамі Інстытута імя Гётэ, і беларускі бок вітаў рэалізацыю праекта.

Інстытут імя Гётэ будзе аказваць садзейнічанне выбраным беларускім школам, у прыватнасці праз павышэнне кваліфікацыі выкладчыкаў нямецкай мовы, метадычную і дыдактычную падтрымку, стыпендыі для ўдзелу ў моўных курсах і семінарах у Германіі.

Апрача таго, у гэтых школах будуць рэалізоўвацца праекты па развіцці моўнай і міжкультурнай кампетэнцыі (канцэрты, семінары і літаратурныя чытанні). Нямецкі бок надае ўвагу тэхнічнаму аснашчэнню кабінетаў нямецкай мовы, а таксама стварэнню бібліятэкі для настаўнікаў нямецкай мовы.

**Па інфармацыі Пасольства ФРГ у Беларусі**

▸ **ПАЗІЦЫЯ**

# ХАТНЯЕ НАВУЧАННЕ,

## АБО ЦІ ВАРТА ВАДЗІЦЬ ДЗІЦЯ Ў ШКОЛУ

**Вольга ЛІСІЧОНАК**

**«Калісьці непісьменнымі былі тыя, хто не хадзіў у школу, — зараз акурат наадварот».**

**Французскі навеліст Поль Гу**



Photo.ByMedia.net

Калі я стала маці, вырашыла, што падарую свайму дзіцяці самае галоўнае — дзяцінства. Іншымі словамі, не буду ламаць ягоную натуру. Не буду прымушаць стаяць, калі хочацца бегаць, не буду ўсаджваць, калі хочацца стаяць, не буду заганяць дахаты, калі хочацца пагуляць на вуліцы. Не буду адмахвацца ад ягонага жадання атрымліваць адказы на свае пытанні.

Тым не менш, расстаноўка маіх прыярытэтаў на карысць выхавання ў сыне свабоднай асобы ўжо зараз прыводзіць мяне да сур'ёзнага канфлікту з усёй школьнай сістэмай адукацыі. Цікава, дарэчы, што само слова «школа», якое часта асацыюецца з недаспанымі начамі, падарваным здароўем, сапсаванай псіхікай, перакладаецца як «вольны час».

### Не хачу вучыцца

Стагоддзямі дзеці вучыліся дома. Бацькі ці самі займаліся адукацыяй, ці наймалі з гэтай мэтай адмысловых настаўнікаў і гувернёраў. Сітуацыя змянілася толькі з надыходам дзевятнаццатага стагоддзя, калі на змену тагачаснаму хатняму навучанню прыйшлі школы ў звыклым для нас выглядзе. Сучасны іх стан не крытыкуецца, напэўна, толькі лянівымі. Перадусім школьную сістэму абвінавачваюць у тым, што яна адбівае ў дзяцей усялякае жаданне вучыцца. Матэрыял выкладаецца вельмі манатонна ў надзвычай нуднай манеры. На ўроках, дзе прысутнічаюць па 30 чалавек адначасова, педагог пры ўсім жаданні не зможа разглядзець асобнага вучня. Як вынік, дзіця стамляецца, губляе цікавасць да навучання. Акрамя таго, сістэма, дзе адзін дарослы чалавек (не заўжды з выдатнымі маральнымі якасцямі) на шмат гадоў робіцца для маленькага чалавечка Найвышэйшым Аўтарытэтам, прыводзіць да дыскрымінацыі і прыніжэнняў тых у групе, хто нечым адрозніваецца ад іншых ці проста не спадабаўся класнаму кіраўніку.

Другое з адмоўных наступстваў сённяшняй сістэмы школьнага навучання — паламанае здароўе падрастаючага пакалення. Прымусовае сядзенне на адным месцы, цяганне цяжкіх заплечнікаў, хатнія заданні да світання, нерэгулярнае і незбалансаванае харчаванне, псіхічныя перагрузкі, абцяжараныя ідэалагічнай муштрой, маюць сваім вынікам працяглы спіс захворванняў, на якія бядуе большасць нашых шкаляроў: захворванне органаў дыхання, кровазвароту, стрававання, шкілету… Аднак перадусім знікае жаданне вучыцца. Такое натуральнае для дзіцяці. Любы карапуз задае сваім бацькам тысячы сваіх «чаму». А вось за партай гэта прага ведаў хутка некуды знікае. Чаму? Адно відавочна: значыць, такая сістэма. Не выключаю, што нават Леанарда да Вінчы сучаснымі педагогамі быў бы прызнаны абсалютна бяздарнай асобай, не здольнай нават пісаць злева направа, як гэта робяць усе нармальныя людзі.

### Матывацыя

Дык якое выйсце тут можа быць? Няўжо не вадзіць дзіця ў школу? Некаторыя бацькі так і робяць. Больш за тое, папулярнасць хатняга навучання набірае абароты. Так, у Канадзе ў 1979 годзе навучаліся дома ўсяго толькі каля 2000 дзяцей, у 1996-м — ужо 17523, ці 0,4 працэнта ад усёй колькасці зарэгістраваных вучняў. У ЗША ў 1985 годзе — 50000 дзяцей, у 1992 годзе — 300000, у 1999-м — 850 000. Зараз на хатнім навучанні знаходзяцца ад 2,4 да 3,4 працэнта ўсіх школьнікаў ЗША.

У 1999 годзе сярод паўночна-амерыканскіх бацькоў, якія выказаліся за перавод сваіх дзяцей на хатняе навучанне, было праведзена адмысловае анкетаванне з мэтай выявіць іхнюю матывацыю. Дык вось, на іх погляд, такая форма навучання:

- дае магчымасць закласці ў дзіця сваю сістэму каштоўнасцяў;
- гарантуе лепшыя акадэмічныя паказнікі;
- дае магчымасць пабудовы шчыльных і моцных сувязяў паміж бацькамі і дзецьмі;
- дае магчымасць для дзіцяці камунікаваць з дарослымі і дзецьмі на вышэйшым узроўні;
- дазваляе пазбавіцца негатыўных уплываў (наркотыкі, алкаголь, ранні секс) праз кантраляваныя пазітыўныя кантакты з аднагодкамі;
- забяспечвае фізічна больш спрыяльныя ўмовы навучання.

### Перспектыва

У Беларусі хатняя сістэма адукацыі не мае пакуль шырокага распаўсюду. Але ўжо ёсць. Бацькі, што вырашылі не вадзіць сваё дзіця ў школу, карыстаюцца тут правам, якім надзелены агульна адукацыйныя ўстановы нашай краіны, аказваць «атэстацыю ў парадку экстэрнату для асоб, што атрымліваюць агульную базавую і агульную сярэднюю адукацыю самастойна». І гэта па сутнасці адзіны заканадаўчы рэгулятар хатняга навучання. Тут Беларусь адстае нават ад сваіх бліжэйшых суседзяў. Для прыкладу, дазвол на хатнюю адукацыю ў Расіі быў замацаваны ажно ў 1992 годзе ўказам тагачаснага прэзідэнта. Расійскія школы, у адрозненні ад беларускіх, абавязаныя спрыяць жаданню бацькоў адукоўваць сваіх дзяцей дома.

На дадзены момант у РФ дзейнічае шэраг арганізацый і асацыяцый, функцыянуюць шматлікія сайты, скіраваныя на дапамогу сем'ям, што навучаюць дзяцей дома. Акрамя таго, паводле расейскага заканадаўства, такім бацькам нават даюцца выплаты з боку дзяржавы.

У ЗША дынаміка пераходу да хатняга навучання паскорылася пасля выхаду ў свет у 1988 годзе кнігі Дэвіда і Мікі Колфаксаў (David and Micki Colfax) «Хатняе навучанне для поспеху» (Homeschooling for Excellence). У гэтай кнізе аўтары — муж і жонка — распавялі, як гадавалі сваіх чатырох сыноў на далёкім ранча ў Паўночнай Каліфорніі ўласнымі высілкамі. Трое з сыноў бліскуча паступілі ў Гарвард, чацвёрты — у Масачусецкі Тэхналагічны інстытут. Усе атрымлівалі стыпендыі падчас навучання.

Мяркую, што і Беларусь рана ці позна чакае трывалае ўзрастанне адсоткаў «хатніх» вучняў. Трэба толькі дачакацца, калі дарослым надакучыць працаваць адно на лекі сваіх дзяцей, і яны наважацца глядзець у шчаслівыя ўсмешкі ўласных вучняў.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 21 КРАСАВІКА, ПАНЯДЗЕЛАК

05.25 Пазнавальны серыял «Зоркі кіно». Надзін Трэнціньян (Францыя).
06.20, 07.05, 08.10 Добрай раніцы, Беларусь!
06.45, 07.45 Зона Х.
07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
07.30, 08.25 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.30 У свеце матораў.
09.05 Фігуры.
09.35 Здароўе.
10.00 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё». «Нам з дзіцём ніхто не патрэбны».
11.05 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.10 А.Маклакаў, Л.Загорская і Б.Шчарбакоў у меладраматычнай камедыі «Старая сяброўка» (Украіна). 1-я і 2-я серыі.
14.05 Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
14.30 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.00 Час кіно.
16.30 ЕўраФэст. Дзень за днём.
16.45 Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
17.40 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
18.50, 00.50 Зона Х.
19.35 Час спорту.
20.00 Ток-шоу «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.45, 00.55 Дэтэктыўны серыял «Лікі».
22.45 К.Сазерленд, Дж.Косма, Р.Карлайл у ваеннай драме «Апошняя вайна».

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10, 03.00,
05.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
10.40 «Ералаш».
11.05 Навіны спорту.
11.10 «Жарт за жартам».
12.00 «Малахаў+».
13.05 Навіны спорту.
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Гадзіла».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.05 «Дачка садоўніка». Шматсер. фільм.
16.10 Навіны спорту.
16.15 Вялікая прэм'ера АНТ: «VI Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь-2008. Мінская вобласць».
18.15 Навіны спорту.
18.20 «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
18.55 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.00 Навіны спорту.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.00 Прэм'ера. Д.Назараў у шматсерыйным фільме «Выклік-2».
23.25 Навіны спорту.
23.30 «Злачынствы стагоддзя».
00.05 «Пахаджэнні геніяльнага ашуканца».
01.00 «Бразільскі футбол на АНТ».
03.20 Навіны спорту.
05.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца. Студыя добрага настрою».
07.45 «Вялікі сняданак».
08.25 «Афрамасквіч». Камедыйны серыял.
09.00 «Тыдзень».
10.00 «Спартыўны тыдзень».
10.40 «Наш дом».
11.00 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
11.10 «Рэбека». Інтэрактыўны тэлесерыял.
12.00 «Танга ўтрох». Тэлесерыял.
12.50 «Наша справа».
13.00 «Ёсць кантакт».
13.50 «Народжаныя ў СССР».
14.30 «Культурнае жыццё».
15.00 «Элен і хлопцы». Маладзёжны серыял.
15.30 «Крутыя хлопцы». Дзённік.
16.00 «Іх называлі «СМЕРШ». Відэафільм.
16.50 «Афрамасквіч». Камедыйны серыял.
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.25 «Танга ўтрох». Тэлесерыял.
20.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 «Кінапанядзелак»: С.Бяляеў і Н.Швец у фільме «Фота маёй дзяўчыны».
22.55 «СТБ-спорт».
23.00 «Крутыя хлопцы». Дзённік.
23.10 «Баец». Тэлесерыял.
00.00 «Закон і крымінал».
00.05 «Сталічны футбол».
00.35 «Громкая справа».
01.25 «Насланнё». Тэлесерыял.
02.15 «Кіно»: К.Ламберт у фільме «Ход каралевай». Германія-ЗША, 1992 г.

06.45 Мультсерыял «Звычайны Норман» (Францыя).1-я серыя.
07.10 Ранішняя падзарадка.
08.10 «Смачна з Барысам Бурдой».
08.40 Нельга растлумачыць, але факт.
09.30 У гэты дзень.
09.35 Час суду з Паўлам Астахавым.
10.20 Святло далёкай зоркі. Эраст Карповіч.
10.50 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
11.45 Добрыя Навіны
12.15 Усё пра бяспеку.
12.45 Доктарскія таямніцы з доктарам А.Цярэшчанка.
13.15 Школа рамонту.
14.10 Тэлебарометр.
14.30 Мультсерыял «Звычайны Норман» (Францыя).1-я серыя.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.05 Няня спяшаецца на дапамогу.
16.00 «Смачна з Барысам Бурдой».
16.35 Час суду з Паўлам Астахавым.
17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
18.35 Навіны культуры.
18.50 Дэтэктыўны серыял «Я целаахоўнік. Кілер да юбілею» (Расія) 1-я серыя.
20.00 Калыханка.
20.20 Беларускае «времечко».
21.25 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
22.25 Хакей. Формула гульні.
22.55 Прафесійны бокс. Бой за званне чэмпіёна свету. Мігель Анхель Кота – Альфонса Гомес.

07.15 Меладрама «Рэпартаж», 1995 г.
09.05 «Ён мог стаць першым».
10.00 «Рэвізор».
10.30 «Спецыяльны карэспандэнт».
11.00 «Прыватны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
11.30 «Фіціль». Сатырычны тэлежурнал.
12.55 Серыял «Чужыя таямніцы».
13.50 Весці - Беларусь.
14.00, 17.00, 19.00 Весці.
14.20 «Кулагін і партнёры».
14.55 Суд ідзе.
15.50 Серыял «Рамэа і Джульета».
16.50 Весці - Беларусь.
17.30 Мясцовы час. Весці-Маскоўская вобласць.
17.50 «Жанчына без мінулага». Серыял.
18.50 Весці-Беларусь.
19.25 Мясцовы час. Весці-Масква.
19.45 Тэлесерыял «Дзве сястры».
20.50 Дабранач, малыя!
21.05 Тэлесерыял «Целаахоўнік». Фільм 3. «Чырвоны дзед».
22.05 Камедыйны тэлесерыял «Вайна ў доме» (ЗША), 2005 г.
23.00 Весці-Беларусь.
23.10 «Весці+».
23.30 «Мой срэбны шар. Таццяна Пельтцэр». Вядучы - Віталій Вульф.

06.00 Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
08.00, 10.00, 16.00, 19.00 Сёння.
09.00 «Смотр».
09.25 «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
10.20 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.15 «Следства вялі...».
13.00 Сёння.
13.35 Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
15.10 «Прафесія-рэпарцёр».
15.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Прыгодніцкая камедыя «Макасіны Маніту».
18.25 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.45 А.Чадаў, Н.Ягорава ў прыгодніцкім серыяле-фэнтазі «Малады ваўкадаў».
20.50 Прэм'ера. Шматсерыйны мастацкі фільм «Ліцейны, 4».
22.00 «Сёння».
22.30 Серыял «Марскія д'яблы-2».
23.35 Серыял «Стаўка на жыццё».

09.30 Ралі. Ралі-рэйд. 1-ы этап.
09.45 Матаспорт па выхадных.
10.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Італіі.105 кг. Мужчыны.
11.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Італіі.105 кг. Мужчыны.
12.00 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 3-і дзень. Прамая трансляцыя.
15.00 Цяжкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы ў Італіі.105 кг. Мужчыны.
16.30 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 3-і дзень. Прамая трансляцыя.
19.00 Футбол. Еўрагалы.
19.45 Вось дык так!!!
20.00 «Вікінг» (бег з перашкодамі).
20.30 Тэніс. Журнал «На шляху да «Ралан Гарос».
20.45 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 3-і дзень. Прамая трансляцыя.
00.00 Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
01.00 Ралі. Ралі-рэйд. 2-і этап.
01.15 Тэніс. Журнал «На шляху да «Ралан Гарос».
01.30 Футбол. Еўрагалы.
02.15 Вось дык так!!!

## 22 КРАСАВІКА, АЎТОРАК

05.30 Авантурна-прыгодніцкі серыял «Фаворскі» (Расія).
06.20, 07.10, 08.10 Добрай раніцы, Беларусь!
06.30, 07.05 Прэс-агляд.
06.45, 07.45 Зона Х.
07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
07.30, 08.30 Дзелавое жыццё.
08.20 Гатуем разам.
08.35 Час спорту.
09.05 Містычны дэтэктыў «Бухта страху» (Расія). Заключная серыя.
10.00 Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
10.55 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
12.15 Актор Юрый Саломін. Лірычная камедыя «Звычайны цуд» (СССР). 1-я серыя.
13.35 Час кіно.
14.00 Час суду. Справы сямейныя.
14.45 Nota Bene.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Камедыйны серыял «Вось дык так!».
15.55 Авантурна-прыгодніцкі серыял «Фаворскі» (Расія).
16.50 Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
17.45 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
18.50, 01.30 Зона Х.
19.35 Сфера інтарэсаў.
19.55 Прэм'ера. Д.Шчарбіна, С.Рабава, О.Вечклева ў аповесці ваенных гадоў «Увага, гаворыць Масква!» (Расія). 1-я серыя.
21.00 Панарама.
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/2 фінала. «Ліверпуль» - «Чэлсі». Прамая трансляцыя.
23.40 М.Кейн у шпіёнскім трылеры «Блакітны лёд» (ЗША-Вялікабрытанія).
01.40 Дзень спорту.
01.50 Камедыйны серыял «Вось дык так!».

06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.20, 03.00,
05.00 Нашы навіны.
06.05 АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
09.05 Чакай мяне.
10.00 «Модны прысуд».
11.05, 13.05, 18.15, 21.00, 23.35, 03.20 Навіны спорту.
11.10 «Адзін супраць усіх».
12.00 «Малахаў+».
13.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
14.10 «Гадзіла».
14.30 «Кантрольная закупка».
15.05 «Дачка садоўніка». Шматсер. фільм.
16.10 Навіны спорту.
16.15 «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
17.10 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.
18.20 «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
18.55 «Таццянін дзень». Шматсер. фільм.
20.00 Час.
21.05 Прэм'ера. Я.Міронаў, М.Фаменка ў шматсерыйным фільме «Апостал».
22.15 Прэм'ера. Д.Назараў у шматсерыйным фільме «Выклік-2».
23.40 Прэм'ера. У.Познер, І.Ургант у праекце «Аднапавярховая Амерыка».
00.40 «Бразільскі футбол на АНТ».
03.25 «Каварства гор». Шматсер. фільм.
04.15 «Маё жыццё і я». Шматсер. фільм.
05.05 «Няхай гавораць» з Андрэем Малахавым.

06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
06.10 «Міншчына».
06.20 «Раніца. Студыя добрага настрою».
07.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
08.30 «Афрамасквіч». Камедыйны серыял.
09.00 «Прачніся і спявай» з Ларысай Грыбалёвай.
09.30 «Ecce homo».
10.00 «Сталічны футбол».
10.40 Анфас.
11.00 «Крутыя хлопцы». Дзённік.
11.10 «Рэбека». Інтэрактыўны тэлесерыял.
12.00 «Танга ўтрох». Тэлесерыял.
12.50 «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
13.00 Журнал шукальнікаў «Сталкер».
13.50 «Чэмпіянат свету па ралі». Аргенціна.
14.40 «Гаргульі». Мультсерыял.
15.00 «Элен і хлопцы». Маладзёжны серыял.
15.30 «Крутыя хлопцы». Дзённік.
15.45 «Далёкія родзічы».
16.00 «СМЕРШ». Відэафільм.
16.50 «Афрамасквіч». Камедыйны серыял.
17.20 «Міншчына».
17.30 «Званая вячэра».
18.25 «Танга ўтрох». Тэлесерыял.
20.05 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 «Аўтапанарама».
20.55 «Салдаты 14». Тэлесерыял.
22.00 «Рэпарцёр СТБ».
22.55 «СТБ-спорт».
23.00 «Крутыя хлопцы». Дзённік.
23.10 «Баец». Тэлесерыял.
00.00 «Закон і крымінал».
00.05 «Гарачы лёд».
00.35 «Надзвычайныя гісторыі».
01.25 «Насланнё». Тэлесерыял. Закл. серыя.

06.45 Мультсерыял «Звычайны Норман» (Францыя). 2-я серыя.
07.10 Ранішняя падзарадка.
08.10 Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
08.45 Дэтэктыўны серыял «Я целаахоўнік. Кілер да юбілею» (Расія) 1-я серыя.
09.35 У гэты дзень.
09.40 Час суду з Паўлам Астахавым.
10.25 Хакей. Формула гульні.
10.55 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
11.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
12.45 Школа рамонту.
13.40 ПРОрух+.
14.00 Мультсерыял «Звычайны Норман» (Францыя). 2-я серыя.
14.25 Мультфільм.
14.55 Пазакласная гадзіна.
15.10 Нельга растлумачыць, але факт.
16.00 Кулінарная праграма «Смачна з Барысам Бурдой».
16.35 Час суду з Паўлам Астахавым.
17.30 Серыял «Жанчына з водарам кавы».
18.35 Навіны культуры.
18.50 Дэтэктыўны серыял «Я целаахоўнік. Кілер да юбілею» (Расія) 2-я серыя.
20.00 Калыханка.
20.20 Беларускае «времечко».
21.25 Спорт-кадр.
21.55 «Іншыя». «Ціхі душыцель».
22.30 Маладзёжная камедыя «Дурнушка Бэці» (ЗША)
23.30 Хакей. НХЛ. Плей-оф. Матч тыдню.

07.00 Добрай раніцы, Расія!
09.00 «Спартак Мішулін. Які ўмее лётаць».
09.50 Тэлесерыял «Дзве сястры».
10.45 Весці. Дзяжурная частка.
11.00 Весці.
11.25 Мясцовы час. Весці-Масква.
11.45 Тэлесерыял «Целаахоўнік». Фільм 3. «Чырвоны дзед».
12.35 «У Гарадку».
12.55 Серыял «Чужыя таямніцы».
13.50 Весці - Беларусь.
14.00 Весці.
14.20 «Кулагін і партнёры».
14.55 Суд ідзе.
15.50 Серыял «Рамэа і Джульета».
16.50 Весці - Беларусь.
17.00 Весці.
17.30 Мясцовы час. Весці-Маскоўская вобласць.
17.50 «Жанчына без мінулага». Серыял.
18.50 Весці-Беларусь.
19.00 Весці.
19.25 Мясцовы час. Весці-Масква.
19.45 Тэлесерыял «Дзве сястры».
20.50 Дабранач, малыя!
21.05 Тэлесерыял «Канвой PQ-17».
22.05 Камедыйны тэлесерыял «Вайна ў доме» (ЗША), 2005 г.
23.00 Весці-Беларусь.
23.10 Весці +.
23.30 Прэм'ера. «Як адзін лейтэнант вайну спыніў».

06.00 Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
08.00 Сёння.
09.00 Шматсерыйны мастацкі фільм «Ліцейны, 4».
10.00, 16.00, 19.00 Сёння.
10.25 «Чыстасардэчнае прызнанне».
10.50 «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
11.15 Гістарычны дэтэктыўны серыял «Сакрэтная служба яго вялікасці».
13.00 Сёння.
13.30 Серыял «Тамбоўская ваўчыца».
15.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.25 Фантастычны дэтэктыў «Паляўнічы».
18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
19.45 А.Чадаў, Н.Ягорава ў прыгодніцкім серыяле-фэнтазі «Малады ваўкадаў».
20.50 Прэм'ера. Шматсерыйны мастацкі фільм «Ліцейны, 4».
22.00 «Сёння».
22.30 Серыял «Марскія д'яблы-2».
23.35 Серыял «Стаўка на жыццё».

09.30 Ралі. Ралі-рэйд. 2-і этап.
09.45 Тэніс. Журнал «На шляху да «Ралан Гарос».
10.00 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 3-і дзень.
11.15 Футбол. Еўрагалы.
12.00 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 4-ы дзень. Прамая трансляцыя.
15.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/4 фінала. Матчы ў адказ.
16.30 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 4-ы дзень. Прамая трансляцыя.
19.00 Футбол. Еўрагалы.
19.15 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 4-ы дзень. Прамая трансляцыя.
19.45 Вось дык так!!!
20.15 Футбол. Еўрагалы.
21.00 Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 4-ы дзень. Прамая трансляцыя.
00.00 Бокс. Міжнародны паядынак у ЗША (Маямі). Спаборніцтвы ў суперлёгкай вазе. Ю. Гамбоа (Куба) - Х. Рохас (Венесуэла).
01.45 Ралі. Ралі-рэйд. 3-і этап.
02.00 Вось дык так!!!

## 27 КРАСАВІКА, НЯДЗЕЛЯ

**06.05** М.Церахава ў аўтабіяграфічным фільме рэжысёра А.Таркоўскага «Люстэрка» (СССР).
**07.50** Слова Мітрапаліта Філарэта на Уваскрасенне Хрыстова.
**08.00** Існасць.
**08.25** Альманах падарожжаў.
**09.00, 12.00, 14.25** Навіны.
**09.05** Арсенал.
**09.35** Серыял «Давай ажэнімся».
**10.10** Культурныя людзі.
**10.40** Nota Bene.
**11.10** У свеце матораў.
**11.45** ЕўраФэст. Дзень за днём.
**12.10** Т.Дароніна ў сямейнай меладраме «Мачыха» (СССР).
**13.55** Відэофільм АТН «За крок да прызнання». «Дзеці».
**14.35** Навіны рэгіёна.
**14.55** Формула-1. Гран-пры Іспаніі. Прамая трансляцыя.
**16.55** Хакей для ўсіх.
**17.45** Суперлато.
**18.45** П.Мамонаў у псіхалагічнай драме рэжысёра П.Лунгіна «Востраў» (Расія).
**21.00** Панарама тыдню з Максімам Караткіным.
**22.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэажурнал.
**22.55** П.Уокер, Ф.Нero і П.Крус у меладраме «Вось і анёл» (ЗША).
**00.45** Усе стыхіі.

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Джэніфер Эністан, Кортні Кокс, Ліза Кудраў ў шматсерыйным фільме «Сябры».
**09.55** «Шалапутныя нататкі» з Дзмітрыем Крыловым.
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** «Ранішняя пошта».
**12.35** «Разумніцы і разумнікі».
**13.15** «Страсці па насякомых». Дакументальны фільм.
**13.45** «Кінаметры вайны». «Яны родам з дзяцінства».
**14.20** «Я родам з дзяцінства». Мастацкі фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Міжнародная панарама».
**16.40** Прэм'ера. «Апошняе каханне Мікалая Кручкова».
**17.45** Маст. фільм «Скура Саламандры». Расія, 2004 год.
**20.00** Контуры.
**21.05** Вялікая прэм'ера АНТ: «VI Нацыянальны конкурс прыгажосці «Міс Беларусь-2008. Паўфінал у Мінскай вобласці».
**22.35** Што? Дзе? Калі? Фінал.
**00.05** Прэм'ера. Фільм «Графіці». Расія, 2006 год.
**02.00** Прэм'ера. «Пястун лёсу Юрый Якаўлеў».
**03.00** Нашы навіны.
**03.10** Навіны спорту.
**03.15** Фільм Георгія Данелія «Арол і рэшка».
**05.00** Нашы навіны.
**05.05** Пакуль усе дома.

**06.10** «Клуб «Белы папугай».
**06.35** «Дзіцячы сеанс»: «Прыгоды Петрова і Васечкіна». СССР, 1983 г. 2-я серыя.
**07.45** «Урачыстасць урачыстасцей!».
**08.00** «Трое зверху-2». Камедыйны серыял.
**08.55** «Аўтапанарама».
**09.25** «Відавочца прадстаўляе: самае смешнае».
**10.20** «Вялікі сняданак».
**11.00** «Добры дзень, доктар!».
**11.30** «Турысты». Тэлесерыял.
**12.30** «Залатая калекцыя»: драма «Супрацьстаянне». СССР, 1985 г. 3-я серыя.
**13.45** «Геркулес». Мультсерыял.
**14.30** «Лінія лёсу».
**15.00** «Культурнае жыццё» з Аляксандрам Яфрэмавым.
**15.30** «Нядзеля класікі» з Аляксандрам Анісімавым. Дыялогі пра музыку.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Далёкія родзічы».
**17.15** «Чуткі. Скандалы. Сенсацыі. Даследванні».
**18.05** «Святыні Беларусі». Відэофільм.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** «Фільм тыдню»: Ліў Ульман у драме «Сарабанда». Германія-Данія-Швецыя-Фінляндыя-Італія-Аўстрыя, 2004 г.
**22.30** «Спартыўны тыдзень».
**23.00** «Паветраныя гонкі». Вялікабрытанія.
**00.00** «Па поўнай праграме».
**00.35** «Мяне завуць Эрл». Тэлесерыял.
**01.20** «Нашы рэкорды».

**07.40** Благавест.
**08.05** Мір вашаму дому.
**08.15** Бухта капітанаў.
**09.00** Наша пяцёрачка.
**10.05** «Прыстанак душы» «За парогам свету».
**10.35** Школа рамонту.
**11.35** Клуб былых жонак.
**12.45** «Лабірынты: святыя азёры».
**13.10** ПРОрух+.
**13.30** Гаспадар.
**14.00** Святло далёкай зоркі. Віктар Роўда.
**14.30** Дак. фільм «Па імені і жыціе...».
**15.05** «Страсці па культуры». Ток-шоу.
**15.50** Меладраматычны серыял «Дзве зоркі» (Індыя).
**17.45** Камедыйная меладрама «Вяртанне блудлівага мужа» (Украіна).
**19.50** Анекдот. LAD.
**20.10** Тэлебарометр.
**20.30** Правы чалавека.
**20.45** Авантурная камедыя «Скарб» (Расія).
**22.20** ПРОрух+.
**22.50** Рамантычная камедыя «Дзесяць дзён без кахання» (Іспанія).

**07.00** Весці.
**07.10** Маст. фільм «Візіт да Мінатаўра».
**08.30** «Огі і прусакі». Мультсерыял.
**09.00** «Студыя «Здароўе».
**09.35** «Смехапанарама».
**10.07** «Сто да аднаго». Тэлегульня.
**11.00** Весці.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** «Старажытныя адкрыцці». Дакументальны серыял. + мульт.
**13.25** «Відавочнае - неверагоднае».
**14.00** Весці.
**14.20** Мясцовы час. Весці-Масква.
**14.30** Маст. фільм «Гараджане», СССР, 1975.
**16.05** Весці. Дзяжурная частка.
**16.35** «Прыватны дэтэктыў». Аўтарская праграма Эдуарда Пятрова.
**17.10** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон-2008.
**19.00** Весці Тыдня.
**20.00** «Спецыяльны карэспандэнт».
**20.35** Г.Пірс у вострасюжэтным фільме «Першы снег» (ЗША). 2006г.
**22.40** Гала-канцэрт салістаў Беларускай оперы і Марыінскага тэатра.

**07.30** «Дзікі свет» з Цімафеем Бажэнавым.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Іх норавы».
**08.50** «Усё адразу!».
**09.25** «Ядзім дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**10.50** «Авіятары».
**11.25** Камедыйны баявік «Мае шчаслівыя зоркі».
**13.00** Сёння.
**13.25** Камедыйная меладрама «Жаночая інтуіцыя-2».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Барацьба за ўлаласнасць».
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Адвакат».
**19.00** Сёння. Выніковая праграма.
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.40** «Галоўны герой».
**21.50** Э.Бёрнс, Э.Вуд у крымінальнай драме «Дзень пакаяння».
**23.35** «Футбольная ноч».

**09.30** Ралі. Ралі-рэйд. 7-ы этап.
**09.45** Формула-1. Журнал.
**10.15** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Іарданіі». 2-і дзень.
**10.45** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 8-ы дзень.
**12.15** Аўтагонкі. СуперКубак Паршэ (Іспанія, Барселона). Прамая тансляцыя.
**13.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Нідэрландах. Заезд 1-ы. Прамая тансляцыя.
**13.45** Аўтагонкі. Гонкі на трываласць серыі Ле-Ман. 1000 км. Прамая тансляцыя.
**14.15** Суперспорт. Чэмпіянат свету ў Нідэрландах. Прамая тансляцыя.
**15.00** Веласпорт. Льеж - Бастонь - Льеж (Бельгія). Прамая тансляцыя.
**18.00** Футзал. Кубак УЕФА (Расія, Масква). Матч за 3-е месца.
**18.30** Футзал. Кубак УЕФА (Расія, Масква). Фінал. Прамая тансляцыя.
**20.00** Супербайк. Чэмпіянат свету ў Нідэрландах. Заезд 2-і.
**20.30** Мотаспорт па выходных.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі (Шэфілд). 9-ы дзень. Прамая тансляцыя.
**00.00** Аўтагонкі. Гонкі на трываласць серыі Ле-Ман. 1000 км.
**00.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Іарданіі». 3-і дзень.
**01.00** Бокс. Міжнародны паядынак у ЗША (Нью-Йорк). Паўлёгкая вагавая катэгорыя. Г. Старк (ЗША) - А. Ледэсма (Калумбія).
**02.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Іарданіі». 3-і дзень.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» распачынае падпіску на 2008 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем ў рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ________ (по реестру ф. 11)
№ ________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.
(сумма прописью)

Кому Куда: Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________

Адрес ____________
(почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Вид платежа | Дата | Сумма
Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня
Всего
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя: 3012211080010 Лицевой счет: Код 764
УНП*: 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)
Вид платежа | Дата | Сумма
Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня
Всего
Кассир

АФЕРА

# ЯК ЗАРАБЛЯЦЬ ГРОШЫ НА ГІТЛЕРЫ

Іван БІЧ

**25 гадоў таму адбылася адна з самых цікавых і гучных афер у гісторыі: група гісторыкаў намагалася прадаць фальшывыя дзённікі Гітлера.**

Зараз гісторыя афёры нагадвае фарс. 25 красавіка 1983 года Пітэр Кох, галоўны рэдактар ілюстраванага часопісу Stern, падчас спецыяльнай міжнароднай прэс-канферэнцыі абвясціў пра тое, што з’яўляецца ўладальнікам сапраўднага гістарычнага скарбу: 37 сшыткаў дзённікаў Адольфа Гітлера, напісаных яго асабістай рукой. Рукапіс быццам быў знойдзены сярод абломкаў самалёта, збітага ў 1945 годзе. Запісы трапілі ў рукі аднаго калекцыянера, якога знайшоў журналіст выдання.

Іх першым чытачом быў гер Кох. Прачытаўшы дзённікі, ён заявіў, што «гісторыя другой сусветнай мае быць перапісаная наноў». Публікацыя першых фрагментаў запісаў сапраўды стала сенсацыяй.



Калі падробленыя дзённікі трапілі ў Stern, там адразу пазналі почарк Гітлера



Такіх дзённікаў Гітлера Конрад Куйау зрабіў 27 штук. І атрымаў DM55 тыс. за кожны. А потым 4 з паловай года. 1984 год: Конрад Куяу перад будынкам суду ў Гамбургу

Напрыклад, калі меркаваць па запісах, фюрэр быў вельмі незадаволены сумна вядомым габрэйскім пагромам у лістападзе 1938 года. Ён нават — так было прынамсі напісана ў дзённіку — намагаўся спыніць у апошнія хвіліны перад пагромам банды штурмавікоў. Далей — больш. У дзённіках Гітлер піша, як напярэдадні нападу на Польшчу катэгарычна патрабаваў ад Гімлера, каб войскі СС не праводзілі на тэрыторыі суседняй краіны ніякіх рэпрэсій супраць мірных польскіх грамадзян. Ён нават пагражаў яму партыйным судом, калі той не выканае інструкцыю. Гімлер адказаў, што загад фюрэра для яго — закон, і потым, як мы ведаем з падручнікаў гісторыі, свядома парушыў волю лідэра.

Такім чынам, узнік абсалютна новы партрэт Адольфа Гітлера: ён ужо не агрэсіўны палітык, які верыць у антыгуманныя расісцкія міфы, а проста асоба, якой спрытна маніпулюе група нацысцкіх бонзаў пад кіраўніцтвам Гімлера. Прычым у сваім гуманізме на старонках дзённіка Гітлер заходзіць настолькі далёка, што проста не верыш таму, што напісана. Як вам, напрыклад, фігура Гітлера — заснавальніка габрэйскай дзяржавы? Пачакайце смяяцца: калі верыць дзённіку, Гітлер думаў пра стварэнне пасля вайны на захопленых тэрыторыях СССР габрэйскіх калоній, якія мелі б поўную аўтаномію.

Восем дзён свет жыў быццам зачараваны. Якія яшчэ таямніцы знаходзяцца ў тых дзённіках? На хвалі ажыятажу гісторыкаў, што знашлі дзённікі, нават паспелі ўзнагародзіць прэміяй за лепшае навуковае дасягненне года. У сваю чаргу, тыя заявілі, што на борце самалёта былі знойдзеныя не толькі дзённікі Гітлера, а таксама накіды яго кніжак кшталту «Германія і Вільгельм Другі».

На дзевяты дзень падман быў выкрыты: тэхнічная экспертыза почырку аўтара запісаў, зробленая супрацоўнікамі Федэральнага архіву, даказала, што Гітлер іх не пісаў. Усе ўдзельнікі аферы пайшлі пад суд.

Нашто ім было гэта патрэбна? Аўтарамі дзённікаў былі Корнард Кухау, гандляр нацысцкімі рэліквіямі і Герд Хайдэман, супрацоўнік Stern. Абодва пазнаёміліся на глебе цікавасці да гісторыі Трэцяга рэйху. Абодва сапраўды мелі пэўныя праблемы. Так, Кухау марыў набыць яхту Марціна Бормана, а пазней прызнаўся, што праз публікацыю дзённікаў



ЯшчэDM30 тыс. з кожнага сшытка атрымаў фотарэпарцёр Герд Хайнеман,які і зладзіў для Stern гэту выгодную здзелку

меў намер выйсці на кантакт з ветэранамі НСДАП, якія пасля вайны збеглі ад правасуддзя ў Лацінскую Амерыку.

Так ці інакш, яны прынеслі ў рэдакцыю часопіса дзённікі і прапанавалі Коху іх набыць. Кох не быў такім наіўным, каб верыць кожнаму мінаку, і запрасіў да сябе Томаса Вальдэ. Томас Вальдэ адказваў у выданні за рубрыку «сучасная гісторыя». Вальдэ заявіў: няма сумневу, што дзённікі сапраўдныя. З яго ініцыятывы былі пералічаныя першыя два мільёны марак у якасці авансу за дзённікі. Поўны кошт кантракту мусіў скласці 9 мільёнаў марак.

Пазней высветлілася, што Вальдэ таксама быў сябрам групы, якая падрабляла запісы Гітлера. За тое, што ён змог націснуць на кіраўніцтва выдання, аферысты аддалі яму 16 працэнтаў атрыманай на дзённіках сумы.

Аднак сутнасць справы больш цікавая. Па-першае, новы вобраз Гітлера, які прапагандаваў Stern, выклікаў вялікую эйфарыю сярод неанацыстаў. Яны адразу пачалі патрабаваць рэвізіі гісторыі, а канкрэтна вызваліць з турмы Шпандау былога сакратара Гітлера Рудольфа Геса, якога ў Нюрнбергу прыгаварылі да пажыццёвага тэрміну. Гес быў арыштаваны яшчэ ў 1942 годзе, калі прыляцеў у Англію.

Самае смешнае, што, калі верыць «дзённікам» Гітлера, фюрэр планаваў пасласць Геса ў Англію яшчэ да вайны, каб не дапусціць канфлікту Берліна з Лонданам.

Такім чынам, з’яўляецца нейкі нацысцкі след. Магчыма, дзённікі замовілі нацысты?

Але гэта не адзіная версія. Справа датычыцца журналісцкай этыкі. Ці не быў сам рэдактар зацікаўлены ў тым, каб падманваць чытачоў?

Ён свядома адмовіўся праводзіць экспертызу манускрыпту і даў згоду выплаціць аванс за першую частку. І з маркетынгавага боку — не дарма! Кошт кожнага нумару часопісу, дзе друкаваліся дзённікі Гітлера, быў на 20 працэнтаў больш за звычайны. Першы выпуск узняў наклад выдання Коха на 30 працэнтаў. Продаж ліцэнзіі на публікацыю асобнай кніжкай абяцаў проста фантастычныя даходы. Больш таго, калі афёра была раскрытая, улады наклалі часовую забарону на выданне часопісу Stern. Пасля таго, як забарона была знятая, Stern дзякуючы свайму скандальнаму іміджу зарабіў фантастычныя грошы.

Такім чынам, афёра аказалася магчымай, па вялікаму рахунку, дзякуючы чалавечай сквапнасці.

Шмат гісторыкаў, які даследавалі цёмную справу дзённікаў Гітлера, сцвярджаюць, што яны былі напісаныя па заданню нямецкіх спецслужбаў, якія хацелі трошкі рэабілітаваць гісторыю і пазбавіцца негатыўных асацыяцый з фашыстамі. Гісторыя з фальшывымі дзённікамі Гітлера праходзіла на фоне масавых пратэстаў заходніх немцаў супраць размяшчэння ў краіне амерыканскіх крылатых ракет. Любы разгон дэманстрацыі пацыфістаў успрымаўся грамадствам як вяртанне ў 1933 год. Ускосныя факты сапраўды кажуць, што нейкія асобы з ураду хацелі прызнання дзённікаў за праўдзівыя. Галоўны архіў ФРГ не каментаваў змест дзённікаў, хаця хібы і падробка былі відавочныя.

**Шмат гісторыкаў, які даследавалі цёмную справу дзённікаў Гітлера, сцвярджаюць, што яны былі напісаныя па заданню нямецкіх спецслужбаў**

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

На думку беларускіх экспертаў, улады сталі закладнікамі сваёй палітыкі. Раней, да прыпынення расійскіх эканамічных датацый, Аляксандр Лукашэнка казаў пра тое, што ў краіне дастаткова сваіх сродкаў і іншаземныя інвестыцыі не патрэбныя. Пазіцыя па гэтаму пытанню змянілася ў лічаныя гадзіны. Рост коштаў на энергетыку вядзе да росту адмоўнага знешнеэканамічнага сальда. Ужо па выніках лютага яно склала мінус 360 мільёнаў долараў. Пры гэтым мінус у гандлі з Расіяй набліжаецца да 2 мільярдаў долараў, хаця ў студзені ён складаў толькі 1 мільярд. Калі ўзяты тэмп захаваецца, да студзеня наступнага года адмоўнае сальда можа скласці 12 мільярдаў долараў. Намагаючыся атрымаць хуткія інвестыцыі і адначасова захаваць кантроль над галоўнымі прадпрыемствамі краіны, улады вымушаны менш часу траціць на прапрацоўку інвестыцыйных праектаў з пункту гледжання іх бяспекі.

**«Независимая газета» (Расія)**

Праўда, у Расіі ўжо празрыста даюць зразумець, якімі маюць быць магчымыя саступкі з боку Мінска. У Газпраме лічаць, што павышэнне коштаў да 200 долараў — справа вырашаная. Яго можна пазбегнуць адным — уваходам Беларусі ў склад Расіі на правах канфедэрацыі. Некаторыя дэпутаты расійскай думы мараць наконт устаноўкі ў Беларусі ядзернай зброі ў адказ на з’яўленне элементаў амерыканскай ПРА ў Польшчы і Чэхіі. Адным словам, калі ў 2006 годзе Лукашэнку ўдалося ўтрымаць кошт на ўзроўні 100 долараў за 1000 кубаметраў у абмен на продаж 50 працэнтаў акцый Белтрансгазу, што па сутнасці значыла перадачу кантролю над газатранспартнай сістэмай у краіне, то ў 2009 годзе кошт пытання ўжо не будзе вымярацца ў грошах. Прыклад Беларусі ярка сведчыць: калі палітыкі пачынаюць кіравацца матывамі захавання ўлады ў сваіх руках, намерам спадабацца большай частцы насельніцтва, яны прымаюць рашэнні, якія парушаюць суверэнітэт.

**«Зеркало недели» (Украіна)**

Цяпер гэтую старую справу (мультфільмы, якія быццам абражаюць гонар прэзідэнта) узгадалі як прычыну для зачысткі супраць журналістаў. Нічога лепшага прыдумаць не здолелі. Сапраўды, нашто напружвацца? У Беларусі, як у кніжцы Оруэла, усе разумеюць усё як трэба. Разумеюць, што сапраўдная прычыны — мітынг на Дзень Волі, які меў месца ў Мінску 25 сакавіка. Дэманстрантаў збівалі, нягледзячы на камеры. Увесь свет бачыў гэты жорсткі разгон на экранах сваіх тэлепрыёмнікаў. У такой сітуацыі апраўданне расійскім бокам расправы над народам выглядае проста жудасна. І кідае цень на расійскую ўладу. Якія словы не кажы ў падтрымку Лукашэнкі, адзнакі паранойі відавочныя. Беларуская ўлада баіцца любога слова, падазрае ў замаху на дзяржаўны лад і злых намерах усіх, прычым не толькі Захад, аднак і Расію. І робіць учынкі самазабойцы. Гэта і ёсць паранойя.

**«Маркетинг и консалтинг» (Расія)**

Не зразумела, як Лукашэнка на фоне рэпрэсіўнай палітыкі можа спадзявацца на паразуменне з Бруселем. Магчыма, ён лічыць, што можа правесці мяжу паміж знешняй і ўнутранай палітыкай — кропка гледжання, падобная да пазіцыі кіраўніцтва Кітаю, якое таксама не разумее, як Захад можа блытаць «абсалютна розныя рэчы» — правы асобы і знешнюю палітыку. Аднак, магчыма, усё прасцей: Лукашэнка мае моцны палітычны інстынкт. У моманты крызісу ён разумее, дзе трэба адкруціць гайкі, а дзе трошкі закруціць. Дыялог з Захадам — так. Палітычныя свабоды ўнутры краіны — не. На Захадзе з такой канцэпцыяй ён наўрад ці зможа зарабіць пункты. Урад ФРГ, напрыклад, не так даўно (28 сакавіка) даў зразумець, што без прызнання правоў чалавека, а таксама нармальных умоў працы журналістаў на пазітыўную дынаміку ў адносінах да рэжыму Лукашэнкі разлічваць няма сэнсу.

**«Neue Zurcher Zeitung» (Швейцарыя).**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ТУРЦЫЯ

Турэцкі суд прысудзіў курдскую жанчыну-палітыка Лейлу Зана, былую намінантку на Нобелеўскую прэмію міру, да двух гадоў турмы за прапаганду тэрарызму. Пра гэта паведамляе Газета.ру са спасылкай на агенцтва Reuters.

Яна была асуджаная судом горада Д'ярбакір за прамову, сказаную летась на курдскім фэсце. Тады яна заявіла, што курдскі народ мае трох лідэраў — Масуда Барзані, Джалаля Талабані ў паўночным Іраку і зняволенага баевіка Абдулу Аджалана.

### УКРАІНА

Настаяцель Кіева-Пячэрскай лаўры, архіяпіскап Павел ідзе трэцім нумарам у спісе камуністычнай партыі на выбарах у Кіеўскі гарсавет. Першы сакратар кампартыі Украіны Пятро Сіманенка патлумачыў, што святар збіраецца з дапамогай камуністаў змагацца супраць розных сектаў.

У сваіх інтэрв'ю архіепіскап Павел выступае як супернік лібералізму і нетрадыцыйных плыняў. Цяпер ён з'яўляецца дэпутатам Кіеўскага абласнога савета. Гэты мандат ён атрымаў дзякуючы Партыі рэгіёнаў, якую ўзначальвае былы прэм'ер-міністр Украіны Віктар Януковіч.

### ГРУЗІЯ

Прэзідэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі правёў нараду па вырашэнні абхазскай сітуацыі.

Раней Саакашвілі прадставіў кабінету міністраў пакет новых ініцыятыў. Тбілісі прапануе Сухумі «неабмежаваную аўтаномію ў складзе адзінай грузінскай дзяржавы, поўны федэралізм, гарантыі бяспекі і мірнае развіццё».

Кіраўніцтва Грузіі прапануе шырокае прадстаўніцтва абхазскай аўтаноміі ў цэнтральных структурах у выглядзе віцэ-прэзідэнта, права вета на любыя змены ў Канстытуцыі і законах Грузіі, абарону мовы і культуры, і стварэнне свабоднай эканамічнай зоны.

Абхазія скептычна ставіцца да прапановаў Саакашвілі і кажа, што дыялог можа быць працягнуты толькі пасля таго, як Грузія выведзе войскі з Кадорскай цясніны.

### ЛІТВА

14 красавіка ў Вільні распачаўся «Еўрапейскі тыдзень». З вітальным словам на цырымоніі адкрыцця выступіў прарэктар ЕГУ Уладзімір Дунаеў і ініцыятары праекту Паліна Магіліна, Алесь Патапенка і Настасся Мадчанка.

У гэты ж дзень адбылося адкрыццё фотавыставы «Еўропа вачыма беларусаў», на якой прадстаўленыя працы студэнтаў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Здымкі, якія рабіліся ў розных краінах Еўропы, маюць сацыяльную і, па словах аўтараў, нават філасофскую накіраванасць, адлюстроўваюць бачанне Еўропы вачыма беларускіх студэнтаў.

Нагадаем, «Еўрапейскі тыдзень» — міжкультурны студэнцкі праект, у якім прымуць удзел каля 50 студэнтаў і проста маладых людзей з актыўнай жыццёвай пазіцыяй з Беларусі, Літвы, Германіі, Польшчы і Фінляндыі.

У межах тыдня пройдуць канферэнцыі, круглыя сталы, а таксама шэраг інфармацыйных і культурных мерапрыемстваў — сустрэчы з прадстаўнікамі еўрапейскіх структур, фотавыстава, кінапаказы, прысвечаныя беларускай, медыйнай, еўрапейскай праблематыцы і пытанню студэнцкай мабільнасці.

### ВАТЫКАН

Папа Рымскі Бенедыкт XVI заклікаў вернікаў маліцца за поспех яго візіту ў ЗША, які мусіць стаць кропкай «духоўнага абнаўлення» краіны. Як піша газета The Times, пантыфік спадзяецца, што яго візіт, сустрэчы з прэзідэнтам ЗША Джорджам Бушам і малітва на месцы, дзе раней знаходзіліся будынкі Сусветнага гандлёвага цэнтру, стануць пачаткам адраджэння амерыканцаў.

Аднак намер Папы Рымскага памаліцца за выкупленне грахоў тэрарыстаў ужо выклікала шматлікія выказванні. Паводле словаў прадстаўнікоў пантыфіка, гэтыя дзеянні накіраваныя на аднаўленне дыялогу паміж рэлігіямі.

### ПОЛЬШЧА

Па падліках Еўракамісіі, у мінулым годзе польскія рыбакі на 8000 тон перавысілі квоты на промысел траскі ў Балтыйскім моры. З-за гэтага квоты для Польшчы будуць паменшаны на 10 працэнтаў ад «пералову» ў 2008 годзе і на 30 працэнтаў у наступныя тры гады.

Францыя патрабавала павялічэння сваіх квот на промысел траскі. Аднак міністры рыбалавецкай гаспадаркі краін ЕС наўрад ці дадуць на гэта згоду, з-за паграджальнага скарачэння папуляцыі гэтай рыбы.

### БОСНІЯ І ГЕРЦАГАВІНА

У парламенце Босніі і Герцагавіны дасягнуты кампраміс па паліцэйскай рэформе. Праект закона ўхваліла ніжняя палата, а галасаванне ў верхняй палаце можна лічыць простай фармальнасцю.

Боснія падзелена на два аўтаномных рэгіёна — Рэспубліку Сербская і Харвацка-мусульманскую федэрацыю, якія да гэтага часу мелі свае паліцэйскія фармаванні. Пасля чатырохгадовых дэбатаў вакол рэформы, пад ціскам міжнароднай супольнасці, перш за ўсё Еўрасаюзу, прынята рашэнне, што работу праваахоўных структур абодвух рэгіёнаў будуць каардынаваць на цэнтральным узроўні.

Прыняцце рэформы адчыніць для краіны шлях да падпісання «пагаднення аб стабілізацыі і асацыяцыі» з ЕС, пасля чаго Боснія і Герцагавіна можа думаць пра ўступленне ў Еўрасаюз.

---

**АЛІМПІЯДА**

# БІТВА ЗА ФАКЕЛ

*Алег ПЯТРОЎ*

**Грамадзянскія актывісты не здольныя прымусіць урады сваіх краінаў байкатаваць Алімпіяду ў Кітаі, урад якой сістэматычна парушае правы чалавека. Аднак прыпыніць сусветную эстафету алімпійскага факела яны змаглі.**



Як мінімум ужо двойчы алімпійскі агонь быў патушаны з-за атак праваабаронцаў: у Лондане і Парыжы. Чакаецца, што гэта толькі пачатак. Мы назіраем фенемен: калі раней на вуліцах з'яўляўся атлет з факелам з Алімпіі — усе пляскалі ў далоні, то цяпер такога атлета абсыпаюць мацюкамі як прыхільніка камуністычнай дыктатуры і Кітаю і хіба толькі не б'юць.

З-за чаго ўвогуле ўсё пачалося? Варта спачатку адзначыць, што сама гісторыя байкоту гульняў не абмяжоўваецца выпадкамі 1980 года (Захад байкатаваў Алімпіяду ў Маскве з-за вайны ў Афганістане) і 1984-га (Саветы байкатавалі гульні ў Лос-Анжэлесе быццам з-за адсутнасці гарантый бяспекі для сваіх спартсменаў). Байкоты мелі месца і раней. У 1936 годзе спартсмены, якія адмовіліся ехаць у сталіцу нацысцкай Германіі, сабраліся ў Барселоне. Альтэрнатыўную Алімпіяду не змаглі правесці выключна з-за пачатку мяцяжу генерала Франка. Саветы ўвогуле байкатавалі алімпіяды да 1952 года як забабоны капіталістаў. Існаваў сусветны рух спартсменаў-працоўных. У 1956 годзе некаторыя заходнія краіны адмовіліся ўдзельнічаць у гульнях у Мельбурне (Аўстралія) з-за прысутнасці каманды СССР. Прычына — венгерскае паўстанне, якое мела месца ў тым жа годзе. Савецкія войскі пад кіраўніцтвам маршала Жукава падаўлялі яго танкамі і гарматамі.

Так ці інакш, пакуль палітыкі думаюць, ці адпраўляць нацыянальныя зборныя ў Пекін, грамадзянскія актывісты дзейнічаюць. Яны абвясцілі татальную вайну алімпійскаму факелу, які перад тым, як трапіць у Пекін, мусіць быць пранесены праз шмат краінаў.

Сама традыцыя алімпійскага факела ўзнікла як частка рэкламы Алімпіяды ў 1928 годзе. Арганізатары згадалі, што ў старажытных грэкаў падчас Алімпіяды была традыцыя запальваць агеньчыкі ў гонар Зеўса.

Сённяшняй практыцы прынosіць факел з Грэцыі на месца алімпійскіх спаборніцтваў мы абавязаны Карлу Дэму, аднаму з нацысцкіх функцыянераў, які адказваў за арганізацыю гульняў у Берліне ў 1936 годзе. Гітлер пагадзіўся з ідэяй Дэма, таму што бачыў тут арыгінальны сродак прапаганды нацызму. Гэта можна зразумець з фільму «Алімпія», які зняла Лені Рыфеншталь, любімы рэжысёр Гітлера. У фільме тэма алімпійскага агню займае вялікае месца.

Паступова склаўся рытуал: 12 жанчын (звычайна вядомыя грэчаскія актрысы) запальваюць факел ад променяў сонца каля руінаў храма Геры (жонкі Зеўса) у Алімпіі. Эфект узнікнення полымя дасягаецца за кошт парабалічных люстэркаў, якія канцэнтруюць промні на факел. Пасля агонь вязуць на цэнтральны стадыён Алімпіяды, дзе адбываюцца гульні.

Агонь дастаўляюць рознымі спосабамі. У 1948 годзе ўпершыню агонь перавезлі на караблі. Гульні адбываліся ў сталіцы Вялікабрытаніі, якая, як вядома, ляжыць на востраве. Сітуацыя паўтарылася ў 1956 годзе (гульні тады адбываліся ў Стакгольме). А ў 1956 годзе агонь у сталіцу Алімпіяды Мельбурн па сушы везлі вершнікі. Самы цікавы сродак перадачы агню быў ужыты ў 1976 годзе, калі гульні прымаў Манрэаль. З Афінаў быў пасланы радыёсігнал, які з дапамогай нейкага хітрага лазернага механізму выклікаў полымя.

Вельмі важным лічыцца, хто будзе несці факел на апошняй дыстанцыі. Звычайна гэта вядомыя і славутыя спартсмены. Сярод іх былі Мухамед Алі, Мішэль Плаціні. У 1992 годзе агонь на факеле стадыёна запаліла лучнікі, які стралялі ў факел палаючымі ад алімпійскага агню стрэламі. Часам гонар пранесці агонь да факелу на стадыёне надаюць людзям, якія сімвалізуюць алімпійскую ідэю. Так, агонь Алімпіяды 1964 года ў Токіо запаліў японскі атлет, які нарадзіўся 6 жніўня 1945 года ў Хірасіме — той самы дзень, калі амерыканскімі лётчыкамі на горад была скінута атамная бомба. Цікавым быў ход арганізатараў Алімпіяды ў Манрэалі (1976). Гульні адбываліся ў час палітычнай нестабільнасці, калі вельмі актыўнымі былі радыкальныя палітычныя рухі, у тым ліку прыхільнікі выхаду з складу Канады франкамоўнай правінцыі Квебек. Агонь тады на галоўным стадыёне Алімпіяды запалілі два хлопчыкі: адзін з іх казаў паангельску, дугі — па-французску. Такім чынам, Алімпіяда стала акрамя ўсяго сімвалам нацыянальным адзінства Канады.

Пасля таго, як запальваюць факел на галоўным стадыёне, ён гарыць на працягу ўсёй Алімпіяды да цырымоніі закрыцця. Праўда, тут могуць быць выключэнні.

Самае цікавая, што атакі на алімпійскі факел даўно ўжо стаў сродкам выказвання палітычнага пратэсту. Яшчэ ў 1956 годзе, калі атлет нёс факел па вуліцах Мельбурна, яго атакавала група студэнтаў. Такім чынам яны пратэставалі супраць традыцыі, якую прыдумалі нацысты. Спартсмену парвалі трусы, аднак ён захаваў агонь ад антыфашыстаў.

А некаторыя ўрады проста заявілі, што не жадаюць бачыць алімпійскае полымя на сваёй тэрыторыі. Так, урад Тайваню адмовіўся прымаць факел, паколькі потым ён павінны быў быць дастаўлены ў Ганконг і Макао, а адтуль у Пекін. Ганконг і Макао — былыя кітайскія калоніі Вялікабрытаніі і Партугаліі, якія нядаўна перайшлі пад кантроль Пекіна. Такім чынам стыхійна ўзнікала думка, што Тайвань таксама хутка мае стаць часткай камуністычнага Кітаю. Тыбецкі ўрад у эміграцыі крытыкуе ідэю занесці алімпійскі факел на гару Эверэст. На думку дысідэнтаў, гэта стане сімвалам кітайскай каланізацыі іхняга краю.

У прынцыпе, магчыма, крыткам Алімпіяды ў Пекіне і не варта так замарочвацца на тым факеле.

Былі выпадкі, калі не трэба было нейкіх палітычных учынкаў, каб патушыць алімпійскае полымя. У 1976 годзе ў Канадзе агонь патух пасля навальніцы, і паліцэйскі афіцэр аднавіў яго простай запальнічкай. Патух агонь і падчас Алімпіяды 2004 года ў Афінах. Праўда, паколькі месца Алімпія знаходзіцца недалёка, праблему з алімпійскім агнём вырашылі хуценька.

МЕРКАВАННЕ

# МАЛДОВА + ПРЫДНЯСТРОЎЕ = ?


Уладзімір Варонін


Ігар Смірноў

**11 красавіка ўпершыню за сем гадоў сустрэліся лідэр Прыднястроўскай рэспублікі Ігар Смірноў і прэзідэнт Малдовы Уладзімір Варонін. Няўжо Малдова можа зноў стаць адзінай? Пра гэта журналіст Алег Пятроў размаўляе з малдоўскім незалежным журналістам Максімам Кузолевым.**




***— Што прымусіла палітыкаў сустрэцца?***

— Пачнём з таго, што ўсе ведаюць: галоўную ролю ў перамоўным працэсе гуляе Расія. Калі б яна не захацела, ніякай сустрэчы не было. Варонін неаднаразова казаў, што ніколі ні ў якім разе не сядзе за стол перамоваў з Тыраспалем. Малдоўскі бок апошнім часам намагаўся вырашыць тэрытарыяльнае пытанне без Тыраспалю, за кошт кантактаў з Масквой або з Захадам. У сваю чаргу, Тыраспаль дэманстратыўна выйшаў з перамоўнага працэсу. Бакі займаліся правакацыямі адзін супраць другога. Малдова абвясціла ў крымінальны пошук увесь палітычны бамонд Прыднястроўскай рэспублікі, якая адказала той жа манетай. Апошнім фрагментам канфлікту стала так званая «вайна апаратараў». Прыднястроўскія аператары мабільнай сувязі глушылі малдаўскіх, а тыя — прыднястроўскіх. І раптам 7 красавіка Варонін сам тэлефануе Смірнову. Гэта, натуральна, сенсацыя. Аднак цяпер мы ведаем, што напярэдадні Смірнову тэлефанаваў дырэктар расійскага МЗС Лаўроў і загадаў не кідаць трубку, калі ён пачуе ў ёй голас Вароніна. Адным словам, калі б не расійская воля, сустрэчы Смірнова і Вароніна не было б.

***— Ці меў прыклад Косава нейкі ўплыў на сітуацыю ў адносінах Кішынёва і Тыраспаля?***

— Кішынёў, натуральна, адразу заявіў, што не будзе прызнаваць новую балканскую дзяржаву. У сваю чаргу, Прыднястроўе заўсёды казала, што мае больш правоў на незалежнасць, чым Косава. Усе словы заходніх палітыкаў пра тое, што прызнанне Косава — гэта выключэнне, ніхто там не жадаў браць пад увагу. Думаю, у тыраспальскіх колах была надзея, што пасля Косава адбудзецца нейкае паглыбленне адносін з Захадам.

***— У адным з тваіх артыкулаў напісана, што ў Кішынёве ходзяць плёткі пра тое, што Масква дае згоду на ўваход Прыднястроўскай рэспублікі ў склад Малдовы пры ўмове, што Малдова замарозіць інтэграцыю ў структуры NATO і Еўрасаюзу.***

— Гэта інфармацыя была ў маскоўскім «Камерсанце» ў лютым. На маю думку, гэта быў інфармацыйны выкід з боку малдаван. Давайце прызнаем: прысутнасць 1300 расійскіх салдат у Прыднястроўі дазваляе Расіі куды эфектыўней трымаць рэгіён пад кантролем, чым нейкі міфічны нейтральны статус Малдовы. Тым больш, што па канстытуцыі Малдова з'яўляецца пазаблокавай дзяржавай.

***— Сустрэча Смірнова і Вароніна можа быць звязаная з вынікамі саміту NATO ў Бухарэсце, дзе Украіне прынцыпова паабяцалі сяброўства ў Альянсе?***

— Цалкам магчыма. Аднак перш за ўсё актывізацыя пытання, звязанага з адзінствам краіны, трэба Кішынёву. Што мог сказаць Варонін маскоўскім візаві і як ён прымусіў іх націснуць на Тыраспаль? Вось гэта галоўная інтрыга.

***— Якія зараз палітычныя расклады ў Малдове і Прыднястроўі?***

— Калі казаць пра Малдову, то трэба ўзяць пад увагу парламенцкія выбары, якія адбудуцца ў наступным годзе. Кіруючая ў краіне партыя камуністаў губляе папулярнасць (на самай справе, яна праводзіць дастаткова ліберальную палітыку). У мінулым годзе пры татальным адміністратыўным рэсурсе яны не здолелі працiснуць на пасаду кішынёўскага мэра свайго кандыдата. На выбарах у парламент Гагаўзскай аўтаноміі Партыя камуністаў рэспублікі Малдова (ПКМР) таксама не набрала большасці. Не прайшоў прадстаўнік ПКРМ і на пасаду башкана (глава Гагаўзіі). У Малдове зараз фармуюцца новыя палітычныя сілы. Што да Прыднястроўя, то там на 555000 грамадзян існуе 10 партый. Магчыма, гэта звязана з эвалюцыяй самога прыднястроўскага грамадства: у рэгіёне ўзнікаюць розныя фінансава-прамысловыя групы, якія намагаюцца вырашаць свае праблемы праз палітычныя лобі. Магчыма, гэта проста фасад для таго, каб Еўропа прызнала Прыднястроўскую рэспубліку. Так ці інакш, прыднястроўскія ўлады збіраюцца змяніць закон аб выбарах і праводзіць іх па прапарцыйнай сістэме. Мне гэта нагадвае расійскія тэндэнцыі.

***— Якія вынікі мела сустрэча 11 красавіка?***

— Гэта быў афіцыйны старт перамоваў. Плануецца некалькі вялікіх канферэнцый. Яны частковa будуць праходзіць пад патранатам АБСЕ і Еўрасаюзу. Шчыра кажучы, мяркую, што Тыраспаль стаміўся ад свайго марыянетачнага стану, калі з думкай мясцовых лідэраў пагаджаюцца ў апошнюю чаргу. Новая прыднястроўская эліта з вялікім задавальненнем кінецца ў абдымкі Кішынёва.

***— Наколькі саміт паўплываў на палітычную сітуацыю ў рэгіёне?***

— Мне спадабалася думка палітолага Віталя Андыеўскага, які кажа, што Вароніну перамовы патрэбныя дзеля электаральнай перамогі. Што да апазіцыі, то яна знаходзіцца ў стане канфрантацыі і мала рэагуе на падзею. Увогуле, гэта не яе канёк. Правыя нацыяналісты не могуць весці нармальны дыялог з рускамоўнымі. Што тычыцца Прыднястроўя, то яно не адступіць ад прынцыповага патрабавання: захаванне асаблівага статуса. У сваю чаргу, Малдова будзе цягнуць рэгіён у пракрустава ложа Закона аб асобым статусе рэгіёна левага берагу Днястра, які быў прыняты яшчэ ў 2005 годзе і дае Прыднястроўю нейкую аўтаномію. Што атрымаецца, пакажа час.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### УСАМА БЕН ЛАДЭН



Першы тэрарыст на планеце даказаў, што ён не стаіць у баку ад тэхнічнага прагрэсу. Ён забяспечыў студыяй інтэрнэт-тэлебачання свайго галоўнага камісара доктара Сахавары, які хаваецца недзе на мяжы Пакістану і Афганістану і адказвае за ідэйны накірунак у арганізацыі. Раней Сахавары павінен быў адказваць на ўсе пытанні праз аўдыёзапісы, якія пасля размяшчалі на розныя інтэрнэт-сайты. Цяпер Сахавары пачаў адказваць на пытанні зацікаўленых проста ў эфіры інтэрнэт-телебачання, якое наладзіў Al-Sahab — дэпартамент «Аль Каіды», які адказвае за працу з грамадскасцю. Першая ан-лайнавая прэс-канферэнцыя другога чалавека ў «Аль Каідзе» выклікала вялікі рэзананс у свеце. Часам яму ставіліся вельмі правакацыйныя пытанні, напрыклад, ці нясе арганізацыя Бен Ладэна адказнасць за нявінныя ахвяры (падчас тэракту ў Алжыры ў снежні 2007 года быў забіты 41 чалавек, з якіх толькі тры еўрапейцы, іншыя — алжырскія мусульмане). Сам галоўны ідэолаг тэрарыстаў адказваў стандартнымі клішэ: «Мы не забілі ніводнага нявіннага», «На ўсё воля лёсу» і г.д. Цікава, што супрацоўнікі антытэрарыстычных спецслужбаў ананімна заявілі, што трансляцыя Сахавары дазволіла ім даведацца больш пра «Аль Каіду». Напрыклад, яны звярнулі ўвагу, што сябра «Аль Каіды» вельмі эмацыйна рэагаваў на пытанні наконт здароўя Бен Ладэна (ходзяць плёткі, што ён смяротна хворы). Акрамя таго, Сахавары некалькі разоў адзначаў ролю Егіпту ў паходзе супраць Захаду. На думку экспертаў, гэта значыць, што наступную вылазку тэрарыстаў трэба чакаць якраз на берагах Нілу.

### АЛЯКСАНДР ТУРЧЫНАЎ



Віцэ-прэм'ер кабінету Юліі Ціmашэнка прадставіць партыю на датэрміновых выбарах мэра Кіева, якія прызначаныя на канец мая. Рашэнне Юліі выставіць свайго кандыдата — гэта крах ідэі стварэння агульнай кааліцыі дэмакратычных сілаў на выбарах мэра. Цяпер у выбарчай гонцы іх будзе як мінімум два: баксёр Клічко, які ідзе ад сваёй партыі і ючшанкаўскай «Нашай Украіны», і Турчынаў. Прычым усё выглядае так, што БЮТ наўмысна супрацьстаўляе сябе Клічко. Калі баксёр заставіў увесь горад білбордамі з надпісам «Кіеву патрэбны моцны мэр», на турчынаўскіх плакатах напісана «Кіеву патрэбны разумны мэр». Такі расклад сілаў дае шанц Леаніду Чарнавецкаму, цяперашняму бургамістру, застацца на сваёй пасадзе. Паводле закону, кіеўскі гарадскі галава абіраецца ў адзін тур. Пераможцам лічыцца той, хто набраў большую колькасць галасоў. Чарнавецкі, які робіць стаўку на пенсіянераў, якім кожны месяц яго партыя дае бясплатны паёк, карыстаецца даверам прыблізна 25 працэнтаў выбаршчыкаў. Калі б дэмакраты выставілі адзінага кандыдата, ён бы лёгка перамог Чарнавецкага, набраўшы каля 33 працэнтаў. Цяпер гэта лічба будзе падзеленая паміж Клічко і Турчынавым і яшчэ бог ведае кім (стаць мэрам пажадалі ўжо каля 110 чалавек). Цікава, што сярод іх ёсць людзі з прозвішчамі кшталту Клічко і Чарнавецкі (паліттэхналагічны прыём, каб заблытаць выбаршчыкаў). Так ці інакш, балаціроўку Турчынава мясцовыя палітолагі разглядаюць як яшчэ адзін доказ расколу «аранжавых».

### БАРАК АБАМА



Магчымы кандыдат Дэмакратычнай партыі ЗША на выбарах прэзідэнта парушыў адно з табу амерыканскай палітыкі, падключыўшы ў сваю кампанію некалькі музычных груп, якія граюць у стылі рэп. Common, Kweli, The Roots, Q-Tip і іншыя вядомыя рэп-калектывы і спевакі актыўна ўдзельнічаюць у турах Абамы і размяшчаюць на сайтах ролікі, у якіх заклікаюць прагаласаваць за сенатара з Чыкага. Супярэчнасць у тым, што выканаўцы песняў у гэтым стылі вельмі часта прапагандуюць сексуальны гвалт і ідэалізуюць злачынства — частку паўсядзённага жыцця бедных кварталаў. Даказана, што школьнікі, якія расстралялі клас са сваімі таварышамі ў Літэелоне ў 1999 годзе, былі фанатамі рэпу. Аднак сам Абама лічыць, што рэп часта выконвае пазітыўную функцыю: замест таго, каб сыходзіць у арганізаваную злачыннасць, маладыя беспрацоўныя пішуць музыку і таньчаць. Нарэшце, рэп адлюстроўвае сацыяльную сітуацыю і куды лепш за нейкую папсу. Цікава, што ў даўгу не засталася і Хілары Клінтан, якая таксама пачала актыўна сябраваць з групай Gangsta Rapper 50 Cent. Культуролагі ўжо зараз лічаць, што ў краіне адбываецца маленькая культурная рэвалюцыя. Калі чарнаскуры дэмакрат пераможа пад рытмы рэпа ў лістападзе, музыка чорных бедных раёнаў стане самай элітнай музыкай у штатах.

▸ **ТАЯМНІЦЫ БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА**

# МАЛЬТЫЙСКІЯ РЫЦАРЫ І БЕЛАРУСЬ

**Аляксей ХАДЫКА**

**Гэтая гісторыя звязана для мяне з цэлым шэрагам асабістых успамінаў. У лістападзе 1992 года з групай у 30 дзетак з пацярпелага ад Чарнобыльскай аварыі Брагінскага раёну ў якасці перакладчыка і суправаджаючага я накіраваўся ў Італію.**



Казімір Міхал Пац

## Рыцары — чарнобыльцам

Нас чакала правінцыя Пулья і горад Віестэ, размешчаны на самым абцасіку італьянскай паўвыспы. Горад-казка над морам, з саборам і фартэцыяй XIV стагоддзя, які летам да сваіх 10 тысяч насельніцтва прымае яшчэ столькі ж турыстаў, а ў міжсезонны перыяд у тыя гады ператвараўся ў базу адпачынку і лячэння для малых беларусаў. З італьянскага боку праграму спансараваў размешчаны ў Рыме самы старажытны рыцарскі ордэн — Мальтыйскі, цалкам — Сувэрэнны Ваенны Ордэн гаспітальераў Святога Іаана Ерусалімскага, Радоскі і Мальтыйскі.

Фактычна, ордэн — самая малая ў свеце дзяржава, з рэзідэнцыяй у Рыме на Авенціне, непадалёк ад мастакоўскай П'яцца дэ Спан'я, з 12500 грамадзянамі, якія жывуць у розных краінах, але маюць пашпарт ордэна. З урадам, на чале якога ад сакавіка 2008 года стаіць новы Вялікі магістр — брытанец Мэцью Фэстынг.

За апошнія 8 год, як паведамляла ў лістападзе 2007 года дзяржаўнае агенцтва БелТА, гэты зусім малы ордэн-дзяржава выдаткаваў на дапамогу беларускім дзецям, пацярпелым ад чарнобыльскай катастрофы, болей за 7 мільёнаў еўра. Уражвае, ці не так?

Яшчэ адзін асабісты ўспамін. Правёўшы каля месяца ў Віестэ, перажыўшы ў Італіі развал СССР, мы прыехалі з дзеткамі ў Рым на вакзал Рома-Тэрміні, каб спецыяльна замоўленым вагонам у цягніку Рым—Масква даехаць да Кіева, дзе нас мусілі сустракаць бацькі дзяцей. Але маскоўскі цягнік прыехаў без нашага вагона, а ласкавыя расейскія чыгуначнікі патлумачылі нам — вы, маўляў, цяпер самастойныя, дык дабірайцеся самі, як хочаце. Звыклае імперскае хамства і бязладдзе дапамаглі нам, аднак, правесці яшчэ чатыры памятных дні ў Вечным Горадзе. Але найперш трэба было папярэдзіць бацькоў, каб нас не сустракалі праз дзень у Кіеве. А ведаеце, што было самым горшым у Італіі ў 1992 годзе? Тэлефонная сувязь.

Карацей, дзеці даўно ўжо спалі ў адным з маляўнічых кляштараў пад Рымам, куды іх прыстасавалі гасцінныя мальтыйцы, а аўтар гэтых радкоў усё яшчэ спрабаваў датэлефанавацца — ужо з хатняга тэлефона сяброўкі графіні Імакалаты Саляра, якая апекавалася праграмай. Сяброўка, таксама арыстакратка, уладальніца замка на поўначы Італіі, у Рыме жыла ў невялікай трохпакаёўцы ў двухпавярховай сядзібе (што запомнілася — з ліфтам) амаль у цэнтры горада, схаванай за агароджай у невялікім садзе. Вёска Камарын Брагінскага раёна адказала нарэшце а другой гадзіне ночы, і можна было спакойна класціся спаць.

Першае ўражанне з раніцы — пах смачнай кавы, якую гаспадыня паклікала піць за маленькі столік у гасцёўні. А на століку — афорт з аўтапартрэтам Рэмбранта, знакаміты «аўтапартрэт у фесцы», гэтакім спецыфічным галаўным уборы. І першая мая тыпова савецкая рэакцыя — «добрая рэпрадукцыя» — і адказ гаспадыні — «не, арыгінал, як і палотны Тыцыяна на сценах. Папросту ў вас была рэвалюцыя, а ў нас — не. І нашае ў нас засталося ў арыгіналах». Потым, папраўдзе, гаспадыня паскардзілася — маўляў, нямала багатых людзей у свой час у Італіі, і ў яе продкі таксама, паверылі ў Мусаліні. І за гэта большасць італьянскай арыстакратыі паплацілася тым, што пазней Італьянская рэспубліка наклала на іх маёмасць вялікія падаткі. Не расстраляла, не забрала маёмасць, але пакарала фінансава. Вось і даводзіцца, так бы мовіць, зводзіць канцы з канцамі. Але вось дзіва — гэта не перашкаджае чальцам мальтыйскага ордэна займацца дабрачыннасцю.



Жыгімонт Караль Радзівіл

## З гісторыі ордэна

Уласна тым, чым ордэн займаецца ўжо больш за 900 год, ад часу свайго паўстання пры шпіталі Св. Іаанна ў Ерусаліме напрыканцы XI стагоддзя. Братэрства ўзнікла напярэдадні Першага крыжовага паходу (1096–1099) з ініцыятывы заможнага купца з Амальфі. А ў 1120 годзе рэктарам іаанітаў быў абраны Раймон дзю Пюі, першы, хто абвясціў сябе магістрам, а братэрстваператвараў у вайскова-манаскі ордэн. Так пачалася доўгая гісторыя гаспітальераў. І ў гэтай гісторыі быў даволі значны беларускі кавалак. Але пра ўсё сваім парадкам.

Першапачаткова ў шэрагі ордэна прымалі пераважна пілігрымаў. Ужо ў 1100 годзе вылучылася яго жаночае адгалінаванне — іааніткі. Мужчынская частка, асабліва пасля прыняцця адпаведнае пастановы ў 1137 годзе, займалася абаронай Труны Гасподняй і ў цэлым Святой Зямлі ад няверных. Прынятыя за часы Раймона дзю Пюі Рэгулы — Статут — усталявалі ў іаанітаў своеасаблівы кшталт шляхецкай рэспублікі, чальцы якой падзяляліся на тры класы. Першая — рыцары, здольныя да збройнай абароны Святой Труны і веры. Другая класа — капланы, адказныя за выкананне рэлігійных абрадаў. Трэцяя — браты, занятыя вайсковай і шпітальнай службай. Абавязковая ўмова для ўступлення ў ордэн — пацверджаная высакародная генеалогія і беззаганнае жыццё.

Ідэя хрысціянскага рыцарства была надзвычай папулярнай у сярэднявечнай Еўропе, і ўжо ў XIII стагоддзі ордэну ахвяравалі столькі земляў, што ён быў здольны на прыбытькі з іх утрымліваць 19 тысяч узброеных вершнікаў. Адзін толькі кароль Кастыліі і Арагона Альфонс І сваім тастаментам пакінуў рыцарам трэціну дзяржавы. Паступова склаўся геаграфічна-палітычны падзел ордэна на восем «linguae» — моваў, або тэрытарыяльных «языкоў», ад кожнага з якіх вылучалася па аднай асобе на кіраўнічыя пасады. Нацыі дзяліліся на вялікія прыяраты, прыяраты — на бальяжы, а апошнія — на камандорыі, якіх у часы росквіту было каля 700.

Спрэчкі з тампліерамі і каралём Іерусаліму перашкодзілі ордэну абараніць горад у 1191 годзе ад няверных, а ў 1291 годзе іааніты страцілі ўжо ўсе свае замкі, разам са славутым Акка ў Палесціне, і перасяліліся спачатку на выспу Кіпр, а потым Радос. Знішчэнне тампліераў у 1311 годзе ўзбагаціла іаанітаў часткаю іх спадчыны. Да 1522 года ордэн паспяхова бараніўся ад султанаў і нападаў егіпецкага флоту, ствараючы шчыт хрысціянскай Еўропы. Але ў тым годзе ён капітуляваў перад войскам султана Сулеймана Дасканалага. Вялікі хрысціянскі манарх Карл V Габсбург у 1530 годзе падараваў ордэну новую рэзідэнцыю, выспу Мальта, з якой звязаныя наступныя 300 год гісторыі рыцараў.

Але з заняпадам мусульманскай пагрозы занепадала і значэнне ордэна, і ужо Людовік XIV znявважліва забараніў караблям ордэна падыходзіць да французскіх берагоў. А скончыў з самастойнасцю Мальты Напалеон, захапіўшы яе ў чэрвені 1798 года. У гэты час ордэн спрабаваў ратаваць адзін з самых адукаваных еўрапейскіх манархаў Расіі Павел І, той самы, які вызваліў з турмы нашага нацыянальнага героя Касцюшку і аслабіў ціск на уніяцкую царкву, распачаты ягонай паўзвар'яцелай маткаю Кацярынай ІІ. Але разумныя цары ў Расіі доўга не жывуць, і Павел І быў забіты ў Міхайлаўскім замку ў Пецярбурзе — замку, пабудаваным як рэзідэнцыя вялікага магістра Мальтыйскага ордэна. Забіты з інспірацыі ўласнага сына Аляксандра. Так расійская гісторыя вярнулася ў 1801 годзе на свае адвечныя азіяцкія рэйкі, а Мальтыйскі ордэн — у Еўропу. Праўда, адносіны з Расіяй ордэн усё ж аднавіў у 1992 годзе пры Ельцыне.

З 1834 года і па сённяшні дзень ордэн мае рэзідэнцыю ў Рыме.

## Беларуская камандорыя

З Беларуссю, як яшчэ з прыкладна 100 краінамі, яго таксама лучаць дыпламатычныя стасункі. Прадстаўнік ордэна ў нашай краіне — яго эксцэленцыя Пауль Фрыдрых фон Фурхер.

А сувязі з Мальтыйскім ордэнам у Беларусі пачаліся значна раней, калі Жыгімонт Караль Радзівіл (1591–1642), сын славутага заснавальніка Нясвіжскага замка Мікалая Крыштафа Сіроткі, выправіўся па адукацыю ў Еўропу і пазнаёміўся ў Балоніі з мальтыйскім кавалерам Марцінам Судо. Гэта было ў 1608 годзе, і скончылася візітам Жыгімонта Караля на Мальту, уступленнем у ордэн і фундацыяй ягоным бацькам у 1610 годзе на карысць «мальтыйскай камандорыі ў Літве» вёсак Сталовіч (паблізу Баранавіч) і Пацеек. Велічная (зараз праваслаўная) царква, а па сутнасці касцёл св. Іаана Хрысціцеля быў узведзены італьянскім архітэктарам І. Фантана пасля 1740 года, і дапрацаваны пасля 1743 года славутым майстрам «віленскага барока» Глаўбіцам. Аднак ужо ў 1610 годзе там стаяў драўляны касцёл, а з 1639 года — каменная капліца.

Гаспадар, Жыгімонт Караль Радзівіл, як кожны мальтыйскі рыцар, прыняў тры абеты — паслушэнства, жабрацтва і чысціні, з якіх, як паведамляюць гістарычныя крыніцы, не вытрымліваў строга хіба толькі другі — жабрацтва. Ён стала рэзідаваў у Крошыне, маючы дасканалы двор, у якім лічыўся знакаміты пісьменнік, аўтар дзённікавых запісаў Самюэль Маскевіч. У 1616 Радзівіл атрымаў годнасць крайчага каралевы Канстанцыі, другой жонкі караля Жыгімонта ІІІ Вазы. І ў тым жа годзе ад вялікага магістра дэ Віньякура дастаў тытул камандора Кракаўскай камандорыі. Такой на самой справе не было, але следам за Сталовіцкай камандорыяй у Літве Радзівіл спрабаваў пашырыць ордэн у Польшчы. Авантуры жыцця Радзівіла на гэтым не скончыліся: накіраваўшыся ў 1618 годзе на Мальту, ён ганаруецца тытулам генеральнага камісара ордэна для працы ў толькі заснаванай камандорыі ў Вене. У 1621 годзе ўдзельнічае ў бітве пад Хоцімам, дзе 10 кастрычніка войскі Рэчы Паспалітай пад кіраўніцтвам Караля Хадкевіча разбілі турэцкія аддзелы султана Асмана. У 1622 годзе Габсбургі прызначылі Радзівіла гетманам войскаў лісоўчыкаў (праўда, без прэрагатыў «палкоўніцкага чыну»), якімі тады кіраваў Страйноўскі. Прадстаўніком імператарскай (Свяшчэннай Рымскай імперыі германскага народу) адміністрацыі поплеч з Радзівілам у войсках лісоўчыкаў у гэты час быў Леапольд Габсбург. З 1624 года Радзівіл — падчашы ВКЛ, з наступнага года — кіраўнік Познанскай камандорыі Мальтыйскага ордэну іаанітаў.

У 1633 годзе на чале цэлага палка Жыгімонт Караль Радзівіл вызваляў ад маскоўцаў Смаленск (на той час палітычна ды этнічна ўсё яшчэ беларускі горад). З 1636 года, па смерці брата, Альбрыхта

Уладзіслава, стаў галоўным уладаром Нясвіжа.

Сярод яго галоўных царкоўных і свецкіх фундацый, апрача касцёла ў Сталовічах, прыгадаем чатыры уніяцкія царквы, касцёлы ў Дзераўной, шпіталь у Крошыне. Напрыканцы жыцця Радзівіў паспеў атрымаць з дазволу папы рымскага цудатворную скульптуру Маці Божай Ларэтанскай, якая зараз перахоўваецца ў новым касцёле ў Сталовічах. Перад смерцю свой камандорскі крыж і тытул ён перадаў даўняму паплечніку — Міколу Уладзіславу Юдыцкаму. А апошні прытулак атрымаў у капліцы св. Марціна ў базіліцы св. Францішка ў Асізі ў Італіі.

### У помніках мастацтва

Зрэшты, наша задача — не аднаўленне падрабязнай гісторыі мальтыйскага ордэна ў Беларусі, а толькі кароткі эсэістычны ўспамін пра яго праз помнікі мастацтва. Той самы касцёл у Сталовічах. Фігуру Дзевы Марыі Ларэтанскай. Праз гравюрны партрэт Жыгімонта Караля Радзівіла — ужо сярэдзіны XVIII стагоддзя, змешчаны ў знакамітым альбоме Радзівілаў і выкананы паводле малюнкаў нясвіжскага мастака Ксаверыя Дамініка Гескага.

Таму і скончым мы нашу гісторыю яшчэ адным мастацкім помнікам. У Смаленскім музеі захоўваецца вялікая галерэя партрэтаў з Беларусі — некалькі дзесяткаў вобразаў Сапегаў і Пацаў. Ці не лепшы з іх — партрэт мальтыйскага кавалера Казіміра Міхала Паца (памёр у 1719 годзе) гербу Гоздава, вялікага літоўскага пісара, камандора ў Сталовічах і Познані. Яшчэ адзін паўзабыты шэдэўр беларускага мастацтва. Ён знаходзіцца, дзякуй Богу, у экспазіцыі, і ўбачыць яго можна заўсёды, калі працуе музей. Лішняя дадатковая нагода беларускім турыстам не забывацца пра Смаленск. Як і пра іншыя мясціны, звязаныя з лёсамі беларускіх мальтыйцаў.


Сталовічы. Касцёл уніятаў

ФЕСТЫВАЛЬ

# ВЯСНА — БЕЛАРУСКАЯ: НАШЫ Ў КІЕВЕ

Алесь ГІНЗБУРГ

**22 сакавіка — 12 красавіка ў Кіеве адбыўся фестываль сучаснай беларускай культуры «Беларуская вясна». Зводкі навінаў з поўдня так натхнілі аўтара, што ён выправіўся ў дарогу, каб на ўласныя вочы пабачыць закрыццё фестывалю, падчас якога паэтычная зборная Беларусі перамагла Украіну ў міжнародным слэме.**


Пасадзілі на парашу парашутыста... Пэрформанс Віктара Жыбуля

### «Стаю на асфальце, у лыжы абуты...»

Фестываль «Беларуская вясна» ладзіцца сёлета ў другі раз. Адкрыўся ён 22 сакавіка на Хрышчаціку, бурлескным «лыжным забегам на прызы прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі». Мелі месца 3 старты па 5 удзельнікаў і фінал. Гучалі савецкія спартовыя маршы, а прызы пераможцам уручаў Галоўны Лыжнік у вусатай масцы.

22 сакавіка адбыўся паказ фільму «Беларускі рэзістанс», зняты ў Польшчы палітуцекачом Антосем Цялежнікавым, а 24-га кіяне пабачылі «Акупацыі. Містэрыі» Андрэя Кудзіненкі. 29 сакавіка пры аншлагу адбыўся вечар Беларускай флэш-анімацыі, якую нельга не прызнаць характэрным прыкладам сучаснай беларускай палітычнай культуры. З 2 па 10 красавіка дзейнічала выстава «Суседзі: фота і СМІ Беларусі», на якой наведнікі мелі магчымасць «занурыцца ў беларускую медыйную прастору і на ўласным досведзе адчуць яе асаблівасці». Былі прадстаўленыя працы фатографаў Сяргея Грыца, Юліі Дарашкевіч, Андрэя Лянкевіча (Беларусь), Наталлі Краўчук (Украіна) і інш. Дэманстраваліся перадачы беларускага тэлебачання, была даступная свежая беларуская прэса. 5 красавіка адгучаў канцэрт гуртоў «Нагуаль» і «Джамбімбум», які запомніўся публіцы сваёй нечуванай энергетыкай. Пасля канцэрту музыкі па ўласнай ініцыятыве зладзілі для гледачоў фаер-шоў пасярод начнога Кіева.

У параўнанні з мінулым годам, кідаецца ў вочы, наколькі нестандартна і творча падышлі арганізатары да фармату падзеяў. Па словах лідэра ініцыятыўнай групы Сашка Дэмчанкі, яны імкнуліся надаць «Беларускай вясне–2008» больш шырокі, менш палітычны і амаль нефармальны характар. Нават нягледзячы на тое, што многія іх сябры і знаёмыя з Беларусі так ці інакш пацярпелі ад рэжыму. Тася Рубанава, якая адказвала на фестывалі за музычную частку, пачуўшы, што яе суразмоўца з Беларусі, пачынае старанна выгаворваць беларускія словы. «Я замужам за беларусам. Нашыя дзеці павінны расці двухмоўнымі», — кажа яна. Арганізатар літаратурнай часткі Ілько Гладштэйн, студэнт медуніверсітэту, пабачыў выступ беларускіх паэтаў у снежні 2007 года на фестывалі «Харкаўская барыкада» і з таго часу «загарэўся ідэяй зладзіць нешта такое ў Кіеве».

### «Пасадзілі на парашу парашутыста...»

12 красавіка адбылася фінальная падзея кіеўскай «Беларускай вясны» — літаратурная. Адкрылася яна круглым сталом-прэзентацыяй беларускіх аўтараў. Напачатку паэты Віктар Жыбуль і Вера Бурлак зладзілі перформанс «Парашутыст». Бурлак малявала гуашшу па люстэрку чырвонага чалавечка, а Жыбуль дэкламаваў верш пра тое, што «пасадзілі на парашу парашутыста», таму «што паветра належыць дзяржаве», а ён «яго хацеў прысвоіць сабе», седзячы на дзіцячым гаршчку з вязанкай шарыкаў на спіне. Гледачы, узброеныя канцылярскімі кнопкамі, лопалі яго «парашут».

Далей быў непасрэдна круглы стол, які па размяшчэнні мэблі ў памяшканні больш нагадваў ток-шоу. Маладая рэдактарка ўкраінскага часопісу «Крытыка» Багдана Маціяш і паэт Андрэй Хадановіч на чарзе прадстаўлялі ўдзельнікаў, задаючы ім пытанні. Наталка Бабіна прэзентавала серыю «Кнігарня Нашай Нівы» і свае кнігі «Крыві не павідна быць відна» і «Рыбін горад», шакаваўшы некаторых сарамлівых хлопцаў у залі прачытаным урыўкам пра тое, як яе гераіня выганяла чорта анучкай з месячкай. Полька Кася Кваткоўска расказала пра зборнік інтэрв'ю «Кастусёў дзеннік», якую яна склала ў суаўтарстве з беларускай Ларысай Асіпенка і якая прэзентуе чытачу студэнтаў-каліноўцаў, што навучаюцца ў Польшчы. Севярын Кваткоўскі чытаў з сваёй кнігі «Фрашкі да пляшкі» забаўныя гісторыі, якія калісьці здарыліся з ім ва Украіне, і апынуўся самым папулярным беларускім пісьменнікам вечару паводле продажаў. Аліса Бізяева апавяла пра свой інтэрнэт-праект *litara.net* і прадставіла чытачам кнігу Андруся Белавокага «Лесвіца ў нябёсы з адной прыступкі». Максім Клімковіч і Уладзіслаў Архоменка ў рамках прэзентацыі кінараману-фарсу «Янкі, або Астатні наезд на Літве» прызналіся ў любові да Украіны. Таксама прэзентаваліся вершаваныя зборнікі: «Берлібры» Андрэя Хадановіча, «Дзевяностыя forever» Сяргея Прылуцкага, «Цмокі лятуць на нераст» Марыі Мартысевіч. А далей быў СЛЭЭЭЭЭМ!

### «Мой маленькі слухач, уяві, што ты — вялікі крумкач...»

Слэм — паэтычны турнір, на якім глядацкае або літаратурна-крытычнае журы выстаўляе адзнакі паэтам: а) за змест вершаў; б) за артыстызм выканання. Слэм ладзіцца па ўсім свеце, гэта самая модная літаратурная забава апошніх год у Расіі і Украіне, абсалютна невядомая ў Беларусі. Сярод менскіх літаратараў нават ходзіць паранаідальны жарт, што фінал першага беларускага слэму будзе па тэхнічных прычынах перанесены на вуліцу Акрэсціна. Нашы бібліятэкаркі і музейшчыцы хапаюцца за галаву ад просценькіх перформансаў, а тут — сапраўдны паэтычны дэбош, супастаўны па эмоцыях з футбольным матчам.

Падчас першага Міжнароднага слэму Украіна—Беларусь на прызы часопіса культурнага супрацыву «ШО», украінскія і беларускія паэты вытрымалі 6 парных баёў па 3 хвіліны плюс 1 дадатковая хвіліна «давання здачы» кожны. Падчас дадатковай хвіліны беларуска Вера Бурлак крычала свой экспрэсіўны верш аб тым, што яе «маленькі слухач» — «вялікі крумкач», якому яна наразае «крываву вайну» і «гэта цудоўна». Тэма «паэтычнага мяса» не раз гучала з вуснаў артыстычнага арбітра слэму, харкаўскага паэта Арцёма Паляжакі. Зрэшты, кіеўскі крытык Юры Валадарскі адзначыў, што 12 красавіка ў клубе «ПідWALL» Кіева-Магілянскай Акадэміі ўсё было па-сяброўску прыязна, інтэлігентна, інтэлектуальна, неагрэсіўна: «Я лічу, што перамагла дружба», — падсумаваў ён.

Трэнеру ўкраінскай зборнай па слэме Дмытро Лазуткіну на «Беларускай вясне» не шанцавала з самага пачатку. Падчас удзелу ў згаданым ужо лыжным забегу ён зламаў лыжу аб асфальт Хрышчаціку і дакульгаў да фінішу толькі трэцім. Вось і падчас слэму, на якім ён выступаў у ролі «трэнера на полі» з украінскага боку, ён спачатку буяў аптымізмам, карцінна перадаваў публіцы «вітанні ад украінскіх чэмпіёнаў па вольнай барацьбе, якія праганяюць перамогу Украіны», а пасля абвяшчэння выніку (з невялікай перавагай перамагла Беларусь), скіс. Ён, відаць, адзіны пачуваўся як дома на імправізаваным баксёрскім рынгу, які зладзілі для слэмераў пасярод клубу «ПідWALL», — Лазуткін не толькі вядомы ўкраінскі паэт, але і майстар спорту па кікбоксінгу. Аднак украінская зборная не надта сур'ёзна паставілася да яго інструкцыяў і пачала свой выступ па-беларуску — млява і абыякава да жыцця. Алег Коцараў (Харкаў) і Святлана Паваляева (Кіеў) трапілі, проста як пад грузавік, пад Віктара Жыбуля і Веру Бурлак (Менск) адпаведна. Беларусь павяла з вялікім адрывам. Зведзеная амаль у нічыю выступы параў Сэргій Панцюк (Кіеў) — Сяргей Прылуцкі (Берасце), Ларыса Радчанка (Львоў) — Марыя Мартысевіч (Менск) не змянілі розніцы ў ліку. Пасля былі баі, якія ўсё вырашылі. «Інтэлектуальны рэпер» Віталь Рыжкоў (Магілёў) прайграў бліскучаму Паўлу Карабчуку (Луцк—Кіеў), чэмпіёну некалькіх украінскіх слэмаў, улюбёнцу кіеўскай публікі. Напрыканцы была бітва тытанаў: беларускі «трэнер на полі» Андрэй Хадановіч пераканаўча падмяў пад сябе свайго калегу Дмытра Лазуткіна. Карабчук і Хадановіч сталі лідэрамі ў асабістым заліку — кожны атрымаў ад глядацкага журы максімум балаў.

Перамагчы «ў гасцях», ва ўмовах, калі адзнакі выстаўляюць простыя гледачы, на мой погляд, — прэцэдэнт неймаверны. Кіеўская публіка не да канца разумела беларускую мову, але была ўражаная разнастайнасцю беларускай паэзіі і артыстызмам, эмацыйнасцю яе аўтараў. У фінале слэму самыя гарачыя заўзятары выскачылі на рынг, і ў кучы-малой, што ўтварылася, цяжка было разабраць, дзе паэты, а дзе аматары паэзіі. Я ў гэты час гутарыў з Верай Бурлак і Віцем Жыбулем, якія былі проста ў захапленні ад таго, што адбылося: нягледзячы на яўна слэмерскую прыроду сваёй творчасці, у такім спаборніцтве яны ўдзельнічалі ўпершыню.

Энтузіязм беларускай зборнай сведчыць: неўзабаве яны здолеюць арганізаваць для сваіх супернікаў матч-рэванш на сваёй тэрыторыі. І, мяркуючы па тым, наколькі быў незадаволены вынікам першага слэму «Украіна-Беларусь» паэт-кікбаксёр Дмытро Лазуткін, у наступны раз беларусы так проста не выкруцяцца.

Фестываль «Беларуская вясна» скончыўся, пакінуўшы пазітыўныя ўражанні як у беларусаў ад Украіны, так і ва ўкраінцаў ад Беларусі. Гэта, відаць, першая буйная падзея, якая рэпрэзентуе нашу краіну за яе межамі, дзе палітычнае не заглушала культурнае і крэатыўнае, а наадварот, арганічна яго дапаўняла. Урэшце, каму, як не ўкраінцам, — нашым найбліжэйшым суседзям па мове, гісторыі, культуры — найлепей адчуваць, чым ёсць Беларусь і кім ёсць беларусы?

**Аўтар дзякуе рэсурсу Belarus.org.ua за інфармацыйную падтрымку**



На спектаклі «Аркестр» па Ж. Аную, тэатр «Кампанія», 31 сакавіка

# П'ЕСА ЖАНА АНУЯ «АРКЕСТР» У МІНСКУ

Аляксей ХАДЫКА

**31 сакавіка ў малой зале КЗ «Мінск» адбылася чарговая сакавіцкая тэатральная прэм'ера.**

Нагадаем, што ў сакавіку прэм'еры прайшлі таксама ў Купалаўскім тэатры — «Дзеці Ванюшына» па Сяргею Найдзёнаву, і ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі — «Каласы пад сярпом тваім» па Уладзіміру Караткевічу. Гэтым разам гутарка ідзе пра антрэпрызу: малады калектыў тэатр «Кампанія», які налічвае 2 гады ад нараджэння і мае ў сваім рэпертуары 3 п'есы, выступае на арандаванай пляцоўцы.

У пастанове рэжысёра антрэпрызы Андрэя Саўчанкі давалі «Аркестр» Жана Ануя (іншыя спектаклі антрэпрызы — «Эмігранты» С. Мрожака і «Дура» М. Ашара). Як і ў пастаўленай раней «Дуры», спектакль афармляўся таленавітым тэатральным мастаком Андрэем Меранковым, а саліравала пара вядучых акцёраў антрэпрызы — Кірыл Захараў і Алеся Самахавец.

У поўнай згодзе з анонсамі п'есы, афармленне спектакля сапраўды выглядала ўдалым — нестандартныя касцюмы «аркестрантаў» маглі прэтэндаваць на ролі ў паказе авангарднага мадэльера. Тэма спектакля — складанасць чалавечых узаемаадносін дэгуманізаванай эпохі — раскрывалася з вытанчаным мінімалізмам. На сцэне — людзі-манекены. Людзі — аркестровыя інструменты, з прапісанымі загадзя партыямі. Па вялікім рахунку, на беларускай сцэне пабач з геніяльнымі антрэпрызамі Мікалая Пінігіна, ці не лепшымі на постсавецкай прасторы, вельмі цяжка вытрымліваць зададзеную згаданым маэстра высокую планку. І таму, відаць, Андрэй Саўчанка спрабуе ісці менавіта шляхам пошуку вельмі адрозных ад Пінігіна сродкаў, ствараючы хутчэй кантрастную з пінігінскай тэатральную мову.

У чымсьці яна падобная да мовы колішняга Альтэрнатыўнага тэатра, вельмі папулярнага на мяжы 80–90-х гадоў.

Застаецца дадаць, што тэатр «Кампанія» шукае сябе таксама ў пастаноўках музычных шоу, што ён і прадэманстраваў двума днямі пасля прэм'еры згаданага спектакля, калі адзначыў уласны дзень нараджэння капуснікам з удзелам папулярнага спевака Зміцера Вайцюшкевіча 2 красавіка.

АНОНС

## ЛІТАРАТУРНЫЯ СУСТРЭЧЫ НА СЯДЗІБЕ ТБМ

- **24 красавіка — з Анатолем Вярцінскім. «Лірычныя матывы ў літаратуры»**
- **29 красавіка — з Андрэем Федарэнкам. «Рэальнае і нерэальнае ў беларускай літаратуры»**

Уваход вольны. Пачатак сустрэч у 18.00 па адрасу: Мінск, вул. Румянцава, 13 (метро «Плошча перамогі»).

ВЫСТАВА

# «ПАДЗЕМКА»

Аляксей ХАДЫКА

**Галерэя «Падземка» вырашыла адзначыць дзень савецкай касманаўтыкі іранічнай выставай жывапісу, малюнкаў, аб'ектаў і інтэрактыўнай графікі мастака Васіля Пачыцкага.**



Трошкі шакаванага гледача (калі той чакаў сур'ёзнай распрацоўкі тэмы) сустракаюць соц-артаўскія карыкатурныя карціна, дзе Гагарын намаляваны поплеч з дамай, падобнай да англійскай каралевы, малюнкі, скульптуры-інсталяцыі і ноўтбук з дзесяткамі графічных аб'ектаў, якія змяняюць адзін адно. І ўсё на тэму — палёт Гагарына і яго перамовы з ЦУПам і Каралёвым. З галоўным сloганам, які раз-пораз мільгае ў малюнках і графічным інтэрактыве. «Нармальна… Палёт НАРМАЛЬНЫ». Адным словам, хочаце нармальнага настрою — завітайце ў «Падземку» на пр. Незалежнасці, 43.

ПАМЯЦЬ

# ПА ТОЙ БОК, ДЗЕ СУМЛЕННЕ

Эвеліна ДЗВІНСКАЯ

**16 красавіка беларуская дэмакратычная грамада адзначыла 50-годдзе даследчыка Леаніда Маракова.**

Вынікам яго тытанічнай працы, заснаванай на самаахвярнасці, стала выданне цэлай серыі кніг, сярод якіх фундаментальны твор «Ахвяры і карнікі». Каля дзесятка тамоў біяграфій рэпрэсаваных літаратараў, работнікаў культуры і асветы папоўнілі бібліятэкі, музеі і прыватныя фонды. Гэта гісторыі рэпрэсаваных настаўнікаў, жыцці расстраляных праваслаўных і каталіцкіх святароў. Зараз Леанід Маракоў збірае матэрыял для кнігі пра рэпрэсаваных медыкаў. Кнігі памяці — своеасаблівы помнік тысячам пакутнікаў за веру і нацыянальную ідэю.

Адзін чалавек на працягу многіх гадоў робіць тое, над чым павінны працаваць некалькі навукова-даследчых інстытутаў, і перш за ўсё — дзяржава.

Каля 80 працэнтаў культурнай і нацыянальнай эліты было знішчана ў нашай краіне ў 30-я гады (у той час у Расіі і на Украіне — каля 10–30 працэнтаў). 2000 беларускіх святароў і царкоўнаслужыцеляў пацярпелі падчас ганенняў у XX стагоддзі.


Фота з архіва аўтара

ЗВАРОТ

# ІСНАВАННЕ ТБМ ПАД ПАГРОЗАЙ

Язэп ПАЛУБЯТКА

**24 красавіка ўступае ў сілу Указ прэзідэнта РБ за № 533, у адпаведнасці з якім арэндная плата для большасці грамадскіх недзяржаўных арганізацый, якія не займаюцца камерцыйнай дзейнасцю, непамерна павышаецца.**

Гэта датычыць і Таварыства беларускай мовы. Толькі за цэнтральны офіс, што па вуліцы Румянцава, 13 у Мінску, трэба будзе плаціць 846,4 еўра ў месяц. Акрамя таго неабходна будзе плаціць за камунальныя паслугі, тэлефон, інтэрнэт і так далей.

Некаторыя сябры арганізацыі прапануюць правесці датэрміновы з'езд і «разбегчыся па хатах, дзе, седзячы на кухнях, можна колькі заўгодна лаяць дзеючую ўладу, якая адным указам знішчае болей за 1000 грамадскіх арганізацый».

Ёсць і іншыя шляхі выхаду з гэтай сітуацыі. Іх прапануе старшыня ТБМ Алег Трусаў. Каб утрымаць сядзібу ў Мінску і іншых месцах, трэба збіраць штомесяц 5 мільёнаў рублёў. Паколькі зараз 5000 актыўных прыхільнікаў Таварыства беларускай мовы, то кожны месяц яны павінны будуць ахвяраваць па 1000 рублёў. Акрамя таго, Трусаў прапануе распачаць збор подпісаў грамадзян Беларусі пад лістом да адпаведных уладных структураў з просьбай захаваць для ТБМ былыя памеры арэнднай платы. Адпаведныя бланкі зваротаў ужо змешчаны газеце «Наша слова» і на сайце ТБМ. Бланкі таксама можна атрымаць у сядзібе ТБМ. Перад сябрамі Таварыства паўстала задача сабраць не менш як 40 тысяч подпісаў. Кіраўніцтва ТБМ упэўнена, што акцыя будзе паспяховай, бо такія прэцэдэнты ўжо былі.

Чарговы з'езд ТБМ мае адбыцца ў кастрычніку.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 17 сакавіка 2007.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:** 220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214. Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
chasnavinau@gmail.com; http://kamunikat.org/novy_chas.html
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Кульман, 1.

Замова №
Падпісана да друку 18.04.2008. 8.00.
Наклад 3000 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.